ЧЭРВЕНЬ
14
СУБОТА
№ 24 (523)
1941 год
ЦАНА 20 кап.

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І ЎПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

Горкі і МХАТ

Пяць год назад наша краіна панесла цяжкую страту—загінуў любімейшы сын народа, блізкі друг вялікіх геніяў чалавецтва Леніна і Сталіна, выдатнейшы пісьменнік сучаснасці Аляксей Максімавіч Горкі. Жыццё лепшага майстра совецкай літаратуры, натхнёнага барацьбіта за комунізм—А. М. Горкага зладзейска абарвалі подлыя ворагі партыі і народа, трацкісцка-бухарынскія бандыты.

Пяць год назад перастала біцца палымнеючае гарачай любоўю да совецкага народа — будаўніка комунізма—сэрца Максіма Горкага.

Свята беражэ і шануе вялікі совецкі народ памяць аб сваім любімейшым пісьменніку. Творы А. М. Горкага, перакладзеныя на сотні моў і выданыя ў мільёнах экземпляраў, — настольныя кнігі рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі нашай радзімы. Праўдзівыя і страсныя, накіраваныя на выкрыццё подлай сутнасці капіталістычнага рабства і на сцвярджэнне перамог рэволюцыі, поспехаў соцыялізма, творы Горкага вучаць, выхоўваюць, натхняюць працоўных — шматмільённыя масы чытачоў у нашай краіне і ва ўсім свеце. Найвялікшым, найкаштоўнейшым укладам уваходзіць творчасць А. М. Горкага, празаіка і драматурга, паэта і публіцыста, у скарбніцу соцыялістычнай культуры.

Максім Горкі — буравеснік і пясняр першай рускай рэволюцыі, які стварыў бессмяротны помнік 1905 году—аповесць «Маці», аўтар такіх шэдэўраў прозы, як «Маленства» «У людзях», «Мае універсітэты», «Справа Артамонавых», «Клім Самгін» і шматлікія іншыя аповесці, раманы і апавяданні, такіх жэмчужын паэзіі, як «Дзяўчына і смерць», такіх узораў драматургіі, як «Мяшчане», «На дне», «Ворагі», «Егор Булычоў», аўтар выдатнейшых твораў ва ўсіх жанрах,—адкрыў пасля Пушкіна, Гогаля, Талстога новую цудоўную старонку развіцця рускай літаратуры.

І якой вялікай была цікавасць і ўвага Горкага да літаратур усіх народаў, да ўсіх галін мастацтваў, такі вялікі і ўдзячны ўплыў Горкага на развіццё літаратур і мастацтваў народаў усіх братніх совецкіх рэспублік.

Гэта ён, вялікі геній і зодчы рускай літаратуры, першы заўважыў і прывітаў прыход у літаратуру Янкі Купалы і Якуба Коласа. Ён, кіраўнік і выхавацель совецкіх літаратараў, стала і клапатліва дапамагаў развіццю беларускай літаратуры, творчаму росту яе кадраў. Ён няспынна ўмацоўваў і пашыраў дружбу братніх літаратур совецкіх народаў. З яго ініцыятывай, з яго іменем звязана шмат велічных творчых работ совецкіх літаратараў, шмат бліскучых спраў развіцця соцыялістычнай культуры.

Свайму народу — вялікаму совецкаму народу, які ідзе пад пабеданоснымі сцягамі партыі Леніна—Сталіна, аддаў А. М Горкі ўсю сваю натхнёную творчасць, усё сваё жыццё страснага барацьбіта за шчасце чалавецтва, за комунізм. І любоў народа да свайго лепшага «інжынера чалавечых душ», вялікага сазідацеля культуры соцыялістычнай краіны, — невымерна!

У дні пятай гадавіны з дня смерці А. М. Горкага, ушаноўваючы памяць вялікага пісьменніка і любімага друга, беларускі народ сустракае ў сваёй сталіцы тэатр, які носіць імя А. М. Горкага і дзейнасць якога непарыўна звязана з творчасцю А. М. Горкага,—двойчы ордэнаносны Маскоўскі мастацкі Акадэмічны тэатр (МХАТ) — лепшы тэатр Совецкага Саюза і ўсяго свету. Тэатр пачынае свае гастролі паказам беларускаму гледачу выдатнейшага твора Аляксея Максімавіча — п'есы «На дне». Надзвычайная, хвалюючая сустрэча!

Горкі і МХАТ — непарыўнае адзінства. Тэатр адкрыў Горкага — драматурга, а Горкі сваёй драматургіяй вызначыў ідэйную лінію тэатра, яго рэволюцыйную накіраванасць і яго шляхі ўключэння ў соцыялістычнае мастацтва. Развіваючы гэту сваю, горкаўскую, лінію тэатр стаў выдатнай лабараторыяй совецкай драматургіі. — лепшыя творы совецкіх драматургаў сталі асновай яго рэпертуару пасля Кастрычніка. Няспынна працуючы з совецкімі драматургамі, тэатр узбагачае наша тэатральнае мастацтва выдатнейшымі спектаклямі. І трэба пажадаць яму новага бліскучага творчага поспеху ў завяршэнні работы над спектаклем, які пакажа вобразы геніяў рэволюцыі — Леніна і Сталіна, — над пастаноўкай п'есы «Крэмлёўскія куранты» Н. Пагодзіна.

МХАТ — тэатр Горкага і Чэхава. Трапяткая чэхаўская чайка на сцягу тэатра ў год яго адкрыцця азнаменавала імкненне тэатра да жыцця, да праўды пачуццяў і перажыванняў, да надзённых праблем. Чэхаў, драматургію якога ва ўсёй велічы і харастве бліскуча і непраўзойдзена раскрыў тэатр, даў магчымасць тэатру раскрыць свой твар рэалістычнага тэатра, які следуе традыцыям вялікіх майстроў-рэалістаў рускай сцэны Шчэпкіна, Садоўскага, Ленскага. І зашумелі на сцэне гэтага тэатра крылы буравесніка, развінуліся крылы гордага сокала,—драматургія Горкага далей развіла лінію тэатра—лінію жыццёвай праўды, рэалізма, яна абумовіла і яго станаўленне, як вядучага совецкага тэатра, тэатра соцыялістычнага рэалізма.

Горкі стаў драматургам МХАТ у першыя годы работы гэтага тэатра. У 1902 годзе на сцэне МХАТ былі пастаўлены п'есы «На дне» і «Мяшчане». І з гэтага часу тэатр стала працуе па ўзбагачэнню свайго рэпертуару творамі Горкага. Звыш тысячы разоў прайшла на сцэне МХАТ п'еса «На дне», сотні разоў былі паказаны гледачу іншыя п'есы вялікага пролетарскага драматурга, мільёны гледачоў бачылі гэтыя захапляючыя і натхняючыя спектаклі. І надалей яны, п'есы Горкага, застаюцца выдатнейшай жыццёвай сілай рэпертуару МХАТ. Тэатр з кожным годам знаходзіць усё новыя, больш выдатныя і дасканалыя, сродкі для раскрыцця глыбокіх, жыццёва-праўдзівых вобразаў бессмяротных драматургічных твярэнняў Горкага. Неаднакраць звяртаецца і будзе звяртацца тэатр і да драматургіі Чэхава. І аб плённасці гэтага звароту да творчасці Чэхава сведчыць нядаўна ўзноўлены В. І. Неміровічам-Данчэнкам спектакль «Тры сястры»—выдатнейшы твор тэатральнага мастацтва нашай краіны ў мінулым сезоне.

І любоў Горкага да лепшага, прагрэсіўнейшага тэатра эпохі, МХАТ, была незвычайнай, глыбокай. Нездарма сказаў Горкі аб Мастацкім тэатры так: «не любіць яго—немагчыма, не працаваць для яго—злачынства...» Выражаючы думку ўсяго совецкага народа, пісаў Аляксей Максімавіч заснавальніку і кіраўніку МХАТ К. С. Станіслаўскаму ў 1933 годзе: «Вы і В. І. Неміровіч-Данчэнка стварылі ўзорны тэатр, адно з буйнейшых дасягненняў рускай мастацкай культуры, благародны ўплыў вашага тэатра яўны і прызнаны ва ўсім свеце»... «Вы стварылі саліднейшую армію здзіўляюча таленавітых работнікаў сцэны, многія з іх, ідучы вашым шляхам, таксама сталі настаўнікамі сцэнічнага мастацтва, выхавалі і няспынна выхоўваюць новыя групы выдатных дзеячоў сцэны...» «Работай гэтай вы, цудоўны і тонкі артыст, даказалі яшчэ раз, як багата і невычарпальна гераічная энергія нашай краіны».

Новую, ярчэйшую старонку гісторыі тэатральнага мастацтва адкрыў МХАТ. Ён высока ўзняў сцяг рэалістычнага тэатра. Ён адкрыў цудоўную драматургію Горкага і Чэхава. Ён стаў лепшай школай совецкіх драматургаў і ён, дзе раскрыўся геній Станіслаўскага, даў совецкаму тэатру выдатнейшыя прынцыпы мастацтва сцэны—«сістэму» Станіслаўскага, сістэму выяўлення жыццёвай праўды, сапраўднага натхнёнага майстэрства і няўтомных пошукаў новага, дзярзанняў.

Надзвычайна вялікі і ўдзячны ўплыў МХАТ на творчасць усіх тэатраў Совецкага Саюза. Гэтаму жыватворчаму ўплыву абавязана сваімі бліскучымі поспехамі і беларускае тэатральнае мастацтва. Развіваючыся ў цеснай творчай сувязі з мастацтвам братняга рускага народа, беларускі тэатр вучыўся і рос на лепшых узорах творчасці майстроў рускай сцэны і, у прыватнасці, лепшых прадстаўнікоў яе—майстроў МХАТ. Майстры МХАТ разам з іншымі таленавіцейшымі прадстаўнікамі рускага тэатра аказалі вялікую творчую дапамогу беларускім тэатрам і ў падрыхтоўцы да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Братняя дапамога рэжысуры МХАТ майстрам беларускай сцэны ў пастаноўцы п'есы «Апошнія» М. Горкага, у сцэнічным раскрыцці таленавітай камедыі лаўрэата Сталінскай прэміі К. Крапівы «Хто смяецца апошнім» абумовіла бліскучы поспех гэтых спектакляў.

Непарыўна сувязь лепшых майстроў МХАТ з беларускім мастацтвам. Народны артыст СССР Л. Леанідаў, выпускны клас якога ў Маскоўскім тэатральным інстытуце стаў Гомельскім абласным рускім драматычным тэатрам, трымае сталую сувязь са сваімі выхаванцамі, стала дапамагаючы творчаму фарміраванню тэатра. І Брэсцкі абласны рускі драматычны тэатр, калектыў якога прайшоў выдатную школу ў класе народнага артыста СССР М. Тарханава, развіваецца ў цеснай творчай сувязі са сваім настаўнікам: М. Тарханаў узначальвае мастацкае кіраўніцтва тэатрам.

Плённая творчая сувязь майстроў беларускага тэатральнага мастацтва з МХАТ усё больш узрастае і ўзмацняецца.

Майстры МХАТ, выхаваныя К. С. Станіслаўскім і В. І. Неміровічам-Данчэнкам, слава і гордасць тэатральнага мастацтва нашай краіны, прадстаўнікі старэйшага і малодшага пакалення МХАТ пакажуць сваё бліскучае майстэрства беларускаму гледачу. Натхняючая, радасная сустрэча!

Дні гастролей МХАТ у Мінску—урачыстасць для гледачоў і выдатная творчая школа для работнікаў мастацтваў нашай рэспублікі.

Гарачае прывітанне, Тэатр Горкага, — лепшы ў свеце тэатр!

Літаратурны вечар, прысвечаны А. М. Горкаму

18 чэрвеня, у дзень 5-й гадавіны з дня смерці Аляксея Максімавіча Горкага, Мінскі гарком КП(б)Б, праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў і Акадэмія навук БССР наладжваюць у Доме партыйнай асветы літаратурны вечар, прысвечаны памяці вялікага пісьменніка.

Ве[illegible] віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук БССР народны паэт Якуб Колас.

Даклад аб жыцці і творчай дзейнасці А М Горкага зробіць запрошаны з Масквы прафесар Л. Тімафееў.

Вечар закончыцца канцэртам пры ўдзеле артыстаў Маскоўскага мастацкага Акадэмічнага тэатра імя Горкага (МХАТ) і Одэскага тэатра рэволюцыі.

Да 5-годдзя з дня смерці А. М. Горкага

Змагар за соцыялістычнае мастацтва

Будучы найвялікшым пісьменнікам нашага часу, паклаўшы пачатак рускай рэволюцыйнай і пролетарскай літаратуры, А. М. Горкі, як ніхто іншы, умеў з усім гэтым спалучаць грамадска-літаратурную і крытычную дзейнасць у мастацтве. Азначэнне: мастацтвазнавец — тут будзе недастатковым, вузкім. Гэта быў энцыклапедыст, які цікавіўся ўсімі пытаннямі мастацтва, займаўся вывучэннем і вырашэннем яго шматлікіх праблем, заўсёды ўмеў падымаць іх перад грамадскасцю на прынцыповую вышыню. У галіне мастацтва Горкі быў не толькі даследчыкам, але і ініцыятарам, арганізатарам, натхніцелем тэатраў, мастакоў, майстроў усіх галін рэволюцыйнага мастацтва.

Горкага цікавіў жывапіс, цікавіла скульптура, ён быў вялікім цаніцелем музыкі і збіральнікам фальклору. Ва ўсёй сваёй грамадскай дзейнасці ў галіне мастацтва Горкі праяўляў страсць смелага мастака і глыбокага знаўца пытання. Літаратурныя погляды Горкага ўгрунтаваны на ўласцівым яму сінтэтычным успрыняцці ўсіх мастацтваў, развіваючыхся адначасова з мастацкай літаратурай. Эстэтыка Горкага выхоўвалася на крыніцах народнай творчасці—на народным эпасе, народнай мове, народнай музыцы і выяўленчым мастацтве рускага народа. Горкі заўсёды імкнуўся праблемы мастацтва ставіць на інтэрнацыянальнай аснове, змагаючыся за мастацтва, нацыянальнае па форме, соцыялістычнае па зместу. Яго тэарэтычныя погляды на мастацтва заўсёды былі падмацаваны шматвяковым вопытам гістарычнага развіцця мастацтва. Ленінска-сталінская аснова вырашэння пытання аб культуры была базай яго метадалогіі.

У «Самарской газете» у 1895—96 гг. А. М. Горкім надрукаван рад фельетонаў «Між іншым (дробязі, накіды і т. п.)» пад псеўданімам Іегудзііла Хламіды. У гэтых фельетонах вялікая ўвага ўдзелена мяшчовваму тэатральнаму жыццю. Трапныя вобразы. Яркія карціны бяздарнасці і ўбоства, беспрынцыпнасці і сцяжацельства ў «святым» мастацтве,—вось выкрываўчы змест фельетонаў. У дробязях, калі можна так сказаць, «культурнага» жыцця правінцыі 90-х год мінулага стагоддзя Горкі выкрыў пошлыя бакі беспрасветнай абмежаванасці свету мяшчан, купцоў, чыноўнікаў, якія пад ціскам рэакцыі не маглі дзярзаць аб якім-небудзь прагрэсе (ды і не патрэбен ён быў ім у сытым свінстве), які і абвясціў вайну на ўсё жыццё. Сіла А. М. Горкага ў тым, што ён і ў фельетонных «дробязях» мог быць прынцыповым.

Вось яркая карціна відовішчных «асалод» мешчаніна ў кірмашны дзень, апісаная ў адным з фельетонаў:

«Вішчаць лютыя, разладжаныя шарманкі і арганы... Крычаць, заклікаючы публіку, балаганшчыкі...

У паветры стогн ад музыкі і шуму натоўпу...

...У балаганах.... патураючы карысталюбству і прагнасці чалавека, для яго расстаўлены лоўкімі людзьмі розныя незацейлівыя лавушкі.

Зроблены нейкія самадзельныя рулеткі, якія шпарка пажыраюць працоўныя грашы наіўных людзей». («Самарская газета» № 205, 1895).

Горкі быў бязлітасным і жорсткім да «славутасцей», якія па высокай цане «гандлююць мастацтвам».

«Можна падумаць, што кожная нота п. Фігнера, напрыклад, самому яму 100 рублёў каштуе і (ён) ніяк не можа без страты для сябе прапанаваць яе публіцы танней 150 рублёў». («Самарская газета» № 84, 1896).


У 1896 годзе, пражываючы ў Одэсе і Ніжнім-Ноўгарадзе, Горкі друкуе ў «Нижегородском листке» і «Одесских новостях» шматлікія фельетоны і нарысы. У іх ён горача піша аб гастролях Малага тэатра, аб канцэртах дырыжора Главача, аб сказальніцы Фядосавай, аб кінематографе, аб скульптуры Антакольскага, Гінзбурга, аб жывапісу Айвазоўскага, Бруні, Макоўскага, аб пейзажах Левітана. Высока ўзносячы сапраўднае мастацтва, якое носіць на сабе адбітак сапраўднай мастацкасці, ён здзекуецца з рэкламы мыла фірмай «Брокар» і мастацкіх прэмій у кавалках брокараўскага мыла, з фортэп'янных інструментаў Беккера і Шрэдэра, — іх маглі-б выраблядь вятскія саматужнікі, але гэта мала цікавіць «Расею», дзе вынаходлівая творчая мысль асуджана на гібель. Нарысы і фельетоны (аб ніжагародскім кірмашы і ўсерасійскай выстаўцы) прасякнуты страсцю выкрыцця рускіх нраваў, барацьбы за права на жыццё для свабоднай творчасці, накіраванай на культурную і матэрыяльную карысць народа.

Драматург велізарнага дыяпазону, пясняр чалавечых страсцей, знавец нраваў і соцыяльных грамадскіх адносін у дарэволюцыйнай Расіі, які сваімі творамі натхніў МХАТ на пошукі сапраўднага рэалістычнага мастацтва, Горкі высока цаніў А. Н. Астроўскага, любіў Малы тэатр, быў асабістым другам А. П. Чэхава і прыклаўняўся перад яго талентам. У пісьме да Чэхава (лістапад, 1898) Аляксей Максімавіч піша:

«У апошнім акце «Вані», калі доктар, пасля доўгай паўзы, гаворыць аб гарачыні ў Афрыцы,—я задрыжаў ад захаплення перад вашым талентам і ад страху за людзей, за наша блёклае, жабрачае жыццё».

Аб пастаноўцы п'есы Астроўскага «Снягурачка» у Мастацкім тэатры, у верасні 1900 года, Горкі піша Чэхаву:

«А вось «Снягурачка» — гэта палэся — паверце! Я хаця і дрэнна разумею, але амаль заўсёды беспамылкова адчуваю прыгожае і важнае ў галіне мастацтва».



А. М. Горкі. Партрэт работы І. Бродскага (1935 год).

Любоў да мастакоў, якія чэрпаюць матэрыял і матывы творчасці ў народзе, у Горкага была шчырай, па-дзіцячаму захапляючай. Так мог любіць толькі мастак. У пісьмах да таго-ж Чэхава Горкі піша:

«Музыка ў «Снягурачцы»—каларытна да памрачэння розуму, дарма што яе крывы Грэчанінаў пісаў. Мілы ён чалавек. Любіць народную песню, ведае яе і добра адчувае»... «Васняцоў кланяецца вам. Усё больш я люблю і паважаю гэтага вялікага паэта. Яго Баян—грандыёзная рэч. А колькі ў яго яшчэ жывых, прыгожых сюжэтаў для карцін! Жадаю яму бяссмерця!»

Стварaючы свае бяссмертныя п'есы, Горкі пісаў іменна для МХАТ, які палюбіў за непраўзойдзеную мастацкасць, за мастацкую праўдзівасць.

«Мастацкі тэатр—гэта таксама добра і значна, як Трэцьякоўская галерэя, Васілій Блажэнны і ўсё лепшае ў Маскве. Не любіць яго—немагчыма, не працаваць для яго—злачынства, дальбог!» (Пісьмо да Чэхава, верасень, 1900).

Ненавідзець усё ілжывае, пошлае і прытворнае ў мастацтве, бязмежна любіць усё мастацка-праўдзівае, блізкае чалавеку, усё, што выхоўвае чалавека, што ўзята ад народнай праўды і мудрасці, ад мастацкіх багаццяў народа, што не чужда прыродзе народа,—было нязменным дэвізам Горкага—чалавека-гуманіста, беспрыстраснага цаніцеля мастацтва, да канца адданага ідэалам свабоды чалавека.

Горкі—аптыміст, ён ненавідзіць усё ўпадніцкае, пагарджае дэкадэнцтвам у літаратуры, жывапісу, мастацтве. Ён стрымана гаворыць аб Врубелю, называе яго бясспрэчна таленавітым мастаком, але не захапляецца яго палотнамі. У артыкуле «Поль Верлен і дэкадэнты» Горкі выносіць дэкадэнтам і грамадска-соцыяльнай праслойцы, якая стварыла іх, прысуд:

«Такім чынам, яны, гэтыя расхістаныя, з'яўляюцца як-бы помстліўцамі грамадству, якое стварыла іх, бясконца рознастайнае ў творчасці благога і адмоўнага, якбы розгамі, якімі лёс сячэ культурныя класы Еўропы, за тое, што яны, існуючы так даўно, не стварылі для сябе жыцця, вартага любві».

Сапраўднае і вялікае мастацтва, створанае мастакамі ад народа, бяссмертна ў разуменні Горкага. «Памірае чалавек—народ бяссмертны, і бяссмертны Паэт, чые песні—трэпет сэрца яго Народа»,—гэты надпіс пад партрэтам паэта Джыованні Пасколі ў горадзе Сан-Муро Горкі прыводзіць у «Хроніках заграпічнага жыцця», палемізіруючы з нейкім Барам, які імкнецца абмежаваць выкананне оперы Вагнера «Парсіфаль» толькі адным Байрэцкім тэатрам. Гэта, піша Горкі, роўнасільна таму, што забараніць пераклад на мовы іншых нацый Шэкспіра, Гётэ, Бальзака, Дыккенса і г. д. Гэта непрымірымасць становіцца ўласцівасцю не толькі Горкага-эстэта, але гэта ўжо і непрымірымасць Горкага-публіцыста.

Свае адносіны да Мастацкага тэатра Горкі будаваў не толькі на пачуцці ўлюбёнасці — ён пачуццё абгрунтоўваў на здаровым рассудку, выходзячы з меркаванняў грамадскай карысці. Гэта ён даказаў пратэстам супроць пастаноўкі ў МХАТ інсцэніроўкі па раманах Дастаеўскага «Браты Карамазавы», «Ідыёт» і «Бесы», што магло ў той час аказаць адмоўны ўплыў на моладзь. («Яшчэ аб карамазаўшчыне», — «Русское слово» № 248, 1913).

Крытык Горкі бязлітасны да халтурных замыслаў драмадзелаў. «Творчасць» іх ён жорстка і знішчальна бічуе, аднак дапамагае парадамі падаючым надзею маладым драматургам.

Уплыў А. М. Горкага на фарміраванне і развіццё перадавога мастацтва ў дарэволюцыйнай Расіі і на соцыялістычнае мастацтва Совецкага Саюза—велізарны. Пісьменнік, паэт, драматург, мысліцель і гуманіст Горкі быў і застаецца сцягам барацьбы за рэалістычнае мастацтва, блізкае народным масам, пастаўленае на службу выхавання нашага грамадства ў духу заветаў В. І. Леніна.

Натхніцель і арганізатар рэволюцыйнага мастацтва, Горкі вёў безупынную барацьбу за развіццё мастацтва пераможнага класа,—класа, якому належыць вядучая роля ў палітыцы і культуры. Ён быў і застаецца найярчэйшым светачам далейшых заваяванняў культуры народа, святкуючага вялікія перамогі соцыялізма.

В. ГЛАЗЫРЫН.

Адлюстраваць у мастацтве народную героіку

Мастакі Беларусі разгарнулі вялікую творчую работу па адлюстраванню ў выяўленчым мастацтве народнага руху за рэалізацыю гістарычнай пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб асушцы і асваенні балот Беларускай ССР. Мастакі выязджаюць у розныя раёны Беларусі — у Палессе, на Гомельшчыну, Віцебшчыну. Група мастакоў: Зевін, Шаўчэнка і аўтар гэтых радкоў наведала Гомельшчыну, Лоеўскі раён, была на рацэ Песачанка, дзе адбываюцца грандыёзныя меліярацыйныя работы.

З вялікім уздымам і энтузіязмам працуюць на асваенні балот тысячы калгаснікаў і калгасніц. Ярка, сонечна, квяціста і ўрачыста на фоне тарфяных балот, якія перарэзваюцца зараз магістральнымі каналамі,ператвараюцца ў квітнеючыя палі і сенажаці. Прырода адступае, здаючы свае вяковыя крэпасці калгаснікам Беларусі, якія на асушаных плошчах былых балот вырошчваюць новыя мільёны пудоў збожжа, бульбы, кок-сагызу, цукровых буракоў, канапель, забяспечваючы далейшы росквіт калгаснай гаспадаркі.

Тэм, сюжэтаў для мастакоў — тысячы. З бачанага, перажытага мною зроблены эцюды, зарысоўкі (масла, гуаш, акварэль, туш), што паслужыць матэрыялам для распрацоўкі эскізаў і вялікай творчай работы над сінтэтычнай карцінай-кампазіцыяй тэматычнага пейзажа—панарамы ракі Песачанкі. Эцюды і зарысоўкі зроблены з розных пунктаў, пры розным асвятленні і стане надвор'я. Зарысавана работа экскаватара, выгляд магістральнага канала, шэствіе людзей з рыдлёўкамі, ларок-дылі-жанс. Зроблены тэматычныя накіды: праца, абед, медпункт, лекцыя-гутарка, адпачынак канцэрт на канале. Увогуле — гэта багацейшы чарнавы матэрыял, які патрабуе вялікай работы.

Варта пажадаць, каб брыгады мастакоў, выязджаючы на меліярацыйныя ўчасткі, мелі магчымасць знаёміць шырокія масы калгаснікаў з творчасцю беларускіх мастакоў, арганізуючы хаця-б невялікія перасовачныя выстаўкі (на аўтамашынах—майстэрнях мастакоў).

На прадстаячую асеннюю мастацкую выстаўку ў Мінску, прысвечаную асушэнню і асваенню балот Беларусі, я прадстаўлю эскіз да пейзажа-панарамы ракі Песачанкі.

Уславіць эпапею працы, паказаць гераічны вобраз жанчыны-калгасніцы Беларусі стаўлю я сваёй творчай задачай. Гэта—тэма, над якой я пачну працаваць пасля скančэння карціны «Беларускія кампазітары», гэтага адказнейшага абавязацельства, узятага мною ў падрыхтоўцы да мастацкай выстаўкі 1942 года «Наша радзіма».

Мастак Н. ТАРАСІКАЎ.



Эцюд — фрагмент да панарамы «Асушка балот на рацэ Песачанка». Работа мастака **Н. Тарасікава.** Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.

Адась Русак

Веснавыя плыні

Зашумелі ў лозах ніцых
З лёдам рэкі ды крыніцы,
Паліліся
Пералівам
Зырка воды ў далячынь.

І плывуць... плывуць у далі
Крыгі, ломячыся ў хвалях,
І паўз берег
Усё наперад
Вадзяная мчыць іх плынь.

А я еду пад дуброву
У спевах раніцы вясновай,
Паласую
Укрутавую
Цаліну крутой гары.

Мы сягоння прывіталі
Наш палетак песняй сталі,
Толькі звонам
Праз загоны
Мчыцца рэха па бары.

Вось і гусі прыляцелі,
Селі ў рэчцы дзесь на мелі..
Гэй, ляціце,
Лапачыце, —
З вамі сэрцу весялей!

«Ціха, ціха... Гляньце, што там:
Пакапанае балота...
Не было так..
Не было так...»
Дзіва дзівіць тут гусей.

За гарою па прагалку
Пракацілася сявалка,
І ад куста
Поле густа
Засявае з краю ў край.

Страпянуліся, як сполах,
Гусі ў далях у жытнёвых.
Над вадою
Чарадою
Паляцелі дзесь за гай.

Не пужайцеся вы, гусі,
Новых рытмаў Беларусі,
Што тут хваляй
Ускалыхалі
Над балотам бор глухі, —

Гэта выйшла з песняй мая
Наша сіла маладая
У разоры
Хаваць гора
І жабрацкія шляхі.

Ленінград, 1941 г.

Новыя творы

В. Таўлай

Першамайскія сцягі

Прачніся досвіткам, таварыш дарагі;
Калісьці ў ноч такую мы не спалі...
Паглянь, як нашы першамайскія сцягі
Палошча золак залацістай хваляй.
Цяпер яны, як дужыя арлы,
На ветры буйным распасцёрлі крылле,
А мы іх некалі, як арлянят малых,
Тулілі к сэрцу і ўзлятаць вучылі.

За пазухай няслі ў спалоханую ноч
Да абступіўшых шлях бяроз высокіх
І паднімалі ўверх на знойдзенай даўно
Вяршыне стромкай—мачце адзінокай.
А пакідаць было балюча аднаго,
Не ведаўшы, ці ён, асірацелы,
Ўзмахне хоць раз крылом, ці ворагі
яго
За крылле спіснуць, са жывое цела.
І заставаўся сам—ахвярны правадыр
Баёў, якія прагрымяць калісьці,
Хоць многа ў рэках працячэ вады
І мо' не раз бярозы зменяць лісце.
І нас таптал часта капыты —
Скажы, таварыш, хто палічыць
паўшых?
А боль, павер, не меншы быў па тых
Чырвонакрылых арлянятах нашых.
І ў верасах датлелі дні тугі,
І ўзняўся, як зара, сцяг найвялікшы
— Сталін.
З палону выйшлі родныя сцягі
І над краінаю затрапяталі.
І сёння, бачыш, распасцёртыя
плывуць —
Увесь збалелы свет яны абняць
ахвочы:
'Трымай-жа войстрым штых і ўзнятай
— галаву,
Калі сцягам палёту шчыра хочаш!

Рэдакцыя ў шапцы

У калгасе імя Сталіна, Ганчарскага сельсовета Лідскага раёна калгасны сход выбраў рэдактарам насценнай газеты «моцнага ў языку» гультая Шулейку Кастуся. Насценная газета не выйшла.

І зімой, і ўлетку
Трэба нам газетка —
Бойкая, зубатая, —
Хто-ж будзе рэдактарам?
Цэлым сходам думалі,
І такі надумалі:
Вось Кастусь Шулейка,
Тонкі, як жалейка,
Ходзіць самапасам,
П'е гарэлку з квасам,
Вершамі кудахтае, —
Выбралі рэдактарам.
Ходзіць наш рэдактар
У шапцы, у рагатай:
— Вось у гэтай шапцы я
Усю нашу рэдакцыю!
Папрасілі — шапку зняў.
Рот разявіўся ў разяў:
З шапкі ад спалоху
Выскачылі блохі...
Налічылі дзесяць блох —
Больш нічога не было:
Чыста, як падмецена.
Вось вам і газеціна!

Таварыш калгаснік,
запомні гэта:
Які рэдактар,
такая газета.
Лідскі раён, 1941.

М. Ліфшыц

Жыццё дзівосна

Жыццё дзівосна ў восемнаццаць год.
Зямля — крыніца шчасця, свет —
без краю,
Глыбока неба, поўна даль яснот,
І толькі пары крылляў нехапае.
Жыццё у трыццаць — дужа.
Зяе сінь.
Красуюць нівы ў залатым дрыжэнні.
І са сваім ты крочыш пакаленнем,
І кліча татаю цябе твой сын.
Жыццё шырока ў пяцьдзесят.
Прастор
Палёў наліты залатым калоссем.
Цябе люляе ціха дзіўны хор
Таго, што адышло і знікла ў просінь.
Дарога скончана у семдзесят.
Тады
Сябры сыходзяцца у цесны круг старыя.
Хай скроні ў інеі — іх сэрцы маладыя.
Яны прыгадваюць агнёвыя гады,
Пакуль унучку восемнаццаць б'е.
І зноў вясна, і ў небе ані хмары,
І неабдымны свет прад ім ўстае,
І ўнучак твой ужо аб крыллях марыць.

Сон і ява

Як камень, самотным маленства было —
Чуў матчыны слёзы, ды бачыў сяло,
Дзе могілкі, цэрквы, разгойсаны шлях,
І старцы насустрач брыдуць ў лахманах.
У лясах выпадала мне днямі блудзіць,
Нібы тут павінен быў кару адбыць.
А ўвечары дома — пайшло так здавён —
У знямозе валіўся на цвёрды услон.
Але толькі вейкі мне сон закрываў,
Як дзень прада мною ўначы узнікаў.
Братоў тады бачыў, любімых сяброў,
І песні вясёлыя слухаў я зноў.
І сам я спяваў і з сябрамі гуляў...
А ўранні хоць кволы, ды шчасны ўставаў.
І тым абагрэты, што бачыў у снах,
Блукаў я ўвесь дзень па лясах, па ярах.

З тых пор праляцелі гады чарадой...
Сны сталі сягонешняй явай маёй:
Куды не пайду па сваёй старане —
Сябры мае ўсюды чакаюць мяне.
[illegible] сябрамі, каторых калісьці я сніў,
[illegible]олю, і песню сваю я злучыў, —
[illegible]ш і жыццё не магу уявіць...
[illegible] толькі спрабую я вочы закрыць —
[illegible] сніцца маленства, што колісь
прайшло.
[illegible]чыны слёзы і наша сяло.
[illegible] огілкі, цэрквы, разгойсаны шлях,
[illegible]цы насустрач брыдуць ў лахманах.
[illegible]чынаюся. Цяжкі спачын!
[illegible]а дні, па сябрах уначы
[illegible] мой, будзь вечны, свяці мне
заўжды.
[illegible] не ведаць мінулай жуды.

Пераклаў з яўрэйскай мовы.
А. ЖАУРУК.

Янка Маўр

Балбатун

Урывак з аднаактнай камедыі для калгаснай самадзейнасці

Вуліца перад праўленнем калгаса. Побач — кааператыў. Спевы і музыка: ідзе моладзь.

Галасы: — Глядзіце, ці не дзядзька Ларывон вартуе?
— Ён.
— Хвядос захварэў.
— Спакойнай ночы, дзядзька Ларывон!

Ларывон. Гэта для вас будзе спакойная ноч, а нам ніколі спакою не бывае — ні ўдзень, ні ўночы... Вы можаце сабе бесклапотна скакаць і спяваць, ні аб чым не думаючы, а мы не маем права: на нашых плячах ляжыць гаспадарка... (Моладзь прайшла. Ларывон то ходзіць, то садзіцца на лаву). Брыгадзір, кажа,— камандзір, павінен паказаць прыклад, а хто на гэты прыклад глядзець будзе?.. Зусім мне не трэба было згаджацца... Але ён так лоўка пад'ехаў. (Пазяхае). Колькі часу вартуе Хвядос, і ніякі злодзей да яго не лез... Няўжо ён абавязкова сёння палезе?.. (Задрамаў на лаве, схамянуўся, прайшоўся, спыніўся ля плоту). Хто мне падзякуе, што я тут буду ўсю ноч таўчыся?.. І сабака руды не падзякуе... (Глянуў праз плот на той бок). Праўду кажучы, вартаваць трэба не на відным месцы, а схаваўшыся, каб цябе злодзей не бачыў. А так ніякі дурань не палезе, дарма толькі стаяць будзеш... (Прайшоўся, зноў падышоў да плоту). І чаму абавязкова вартаваць стоячы, ці седзячы?.. Можна і лежачы... Так нават зручней назіраць...

Пералез праз плот і лёг там. Стрэльбу прыставіў да плоту. Пакапашыўся і сціх. Тады ціхенька выйшаў Мікіта. Ён таксама ў кажушку. Прыслухаўся.

Мікіта. Ну, вядома, спіць... Я гэта ведаў. (Нахіліўся праз плот, узяў стрэльбу — і раптам да чагосьці стаў прыслухоўвацца).

Голас Маргарыты. Ларывон!.. Ларывон!.. Дзе ты?.. Гэта я... Ларывон!

Мікіта наставіў каўнер, насунуў на вочы шапку, сеў на лаву і паставіў паміж кален стрэльбу. Выйшла Маргарыта. Падыходзіць да Мікіты, кладзе яму руку на плячо.

Маргарыта. Я даведалася, што ты сёння на варце, і прыйшла да цябе... Каб табе весялей было... (Мікіта маўчыць, схіліўшы галаву на стрэльбу). Але ты, здаецца, зусім не рады. (Садзіцца ля яго). Ларывон! Чаго ты маўчыш?.. Усё яшчэ злуеш?.. За тое, што я з Мікітам пагамапіла?.. Але што мне Мікіта? Тыж ведаеш, што я толькі цябе кахаю... Ну, не сярдуй, мой любы! (Абнімае яго). Скажы што-небудзь... Тыж не ведаеш, што я казала гэтаму Мікіту, а злуеш. Я сказала яму, каб ён адчапіўся ад мяне, вось і ўсё... Ён добры чалавек, гэты Мікіта, але дурны... Хіба можна яго параўнаць з табою, мой любы! Ну, дай я цябе пацалую...

Мікіта (хрыпла). Ідзі ты к чорту!

Маргарыта адскочыла, але падышла зноў.

Маргарыта. Ларывон! Што з табою? Гэтак злаваць праз такое глупства! Яж з Мікітам на людзях сядзела. Хіба я магла дазволіць сабе што-якое? Гэта не тое, што цяпер, адзін-на-адзін з табою. Выкінь ты з галавы сваю бязглуздую рэўнасць. Калі табе так ужо непрыемна, я больш не буду з Мікітам і гаварыць. Ну, давай, памірымся... (Села яму на калені, абхапіла шыю рукамі. Тут ужо Мікіта не вытрымаў, і, паставіўшы стрэльбу ля плоту, моцна абняў Маргарыту). Што гэта ты сёння нейкі не такі?.. Ой, задушыш!.. Не цісні так... (Гэты выкрык разбудзіў Ларывона. Ён выглянуў з-за плоту, за спіной Мікіты, і назірае). Ну, вось бачыш. Даўно-б гэтак. А то злуе няведама чаго. Ох, гэтая дурная рэўнасць! Ты думаеш, калі я з ім ласкавая, то яго кахаю? Ды ні знаку! Ён —чалавек нудны, нецікавы. З ім ад нуды здохнуць можна. Але-ж не магу я гнаць яго ад сябе, як... Усё-ж такі ён чалавек...

У гэты момант як крыкне Ларывон:

Ларывон. А, вось ты як, змяя падкалодная!.. Іш ты, ціхоня! Заб'ю!.. (Маргарыта ўскрыкнула, пабегла, Мікіта за ёю. Раз'юшаны Ларывон, спатыкаючы злосць, стрэліў абы куды. Стрэл устрывожыў людзей. Пачуўся шум, крыкі).

Галасы: — Дзе страляюць?

За сцэнай: — Каля праўлення.
— Сякеру бяры, сякеру!
— Не туды, Мікіта! К праўленню!
— Уцёк, ці злавілі?
— Куды вы, бабы? Там страляюць.

На сцэну з крыкамі: «Што здарылася? Хто? Дзе?» і г. д. выбеглі: старшыня, кааператар, Сымон, Дзяніс, з імі вымушан быў вярнуцца і Мікіта. Асцярожна выглянула і Маргарыта, якую затрымала і прывяла Алеся.

Старшыня. Гэта ты страляў?

Ларывон. Я.

Старшыня. У каго?

Ларывон. Злодзей тут быў.

Старшыня. Што-ж ён рабіў?

Ларывон. Ён, пракляты... ён, мярзотнік... каля крамы круціўся.

Старшыня. І ты ў яго адразу стаў страляць?

Ларывон. Не... ён хацеў залезці ў сярэдзіну.

Старшыня. Якім чынам?

Ларывон. Праз акно.

Старшыня. На тваіх вачах?

Ларывон. Але.

Алеся, Маргарыта, Мікіта не маглі ўстрымацца ад смеху. Алеся крыкнула:

Алеся. Ды ён-жа спаў вунь там, за плотам!

Ларывон. Зусім не спаў, а сядзеў і пільнаваў.

Старшыня. І што-ж ты бачыў?

Ларывон. Я-ж кажу... злодзей хацеў украсці... маю...

Старшыня. Што—тваю?..

Ларывон. Нашу... кааперацыю... (Зноў смех).

Старшыня. Ну, добра. А цяпер, пасля ўсяго гэтага глупства, ты ўсё-ж такі скажы нам праўду: чаго ты страляў? Ці ведаеш ты, што страляніну без прычыны, ды яшчэ ноччу, можна назваць хуліганствам і засудзіць цябе на год?

Ларывон (усхвалявана). Я не мог вытрымаць, калі ўбачыў, што яна... толькі так здавалася... прыкідвалася... а сапраўды яна... яна сапраўды... была...

Старшыня. Ды якая-ж яна магла быць, наша кааперацыя?

Ларывон. Яна была... была незачыненая...

Кааператар. Што ты вярзеш? (Падышоў да крамы). Паглядзіце самі, зачынена яна, ці не?

Старшыня. Вось што, браток: ты, відаць, так забалбатаўся, што зусім страціў розум. Раней яшчэ хоць словы былі разумныя, а цяпер ужо вярзеш бязглуздзіцу несусветную.

Кааператар. Справа ясная: ён спаў, бачыў нейкі сон, потым спрасонку бабахнуў, а цяпер і пляце нямаведама што.

Старшыня. Так, Ларывон?

Ларывон маўчыць.

Старшыня. А колькі ты ўсялякіх добрых слоў нагаварыў на сваім вяку! Сёння яшчэ вось на гэтым самым месцы хваліўся, што сваімі рукамі засыпаў калдобіну, а сапраўды гэта зрабіў Мікіта.

Алеся. (са здзіўленнем, да Маргарыты). Чуеш—ён ведаў!

Старшыня. Сам праз акно бачыў. Вось што Ларывон: паслухайся ты, нарэшце, сябе самога, паслухайся сваіх слоў — больш ад цябе нічога не трэба, і тады будзеш найлепшым калгаснікам. А пакуль брыгадзірам табе быць нельга. Няхай будзе на тваім месцы Мікіта. Ён і на варце цябе заменіць, а ты можаш ісці спаць.

Ларывон моўчкі падаў Мікіту стрэльбу і выйшаў. Людзі пачалі разыходзіцца.

Сымон. Сабраліся з каламі ды тапарамі на злодзея, а злавілі...

Дзяніс. Балбатуна... Няшчасце нейкае, ды годзе: зусім чалавек забалбатаўся.

Старшыня. Будзем спадзявацца, што цяпер ён вылечыцца.

Пайшлі. Маргарыта падышла да Мікіты і працягнула яму руку.

Маргарыта. Дзякую табе, Мікіта, за вароты, а яшчэ больш — за шчырасць. І... выбачай ты мяне... за памылку...

Мікіта. А можа... ты яшчэ калі-небудзь памылішся, а?

Маргарыта. Паглядзім... (Пайшла, за ёю Алеся).

Алеся. Я-ж казала: хто аб табе, сіраціне, паклапоціцца, калі не я?

Выйшлі. Мікіта ўскінуў стрэльбу на плечы і зашагаў, весела прысвістваючы.

Тры кнігі журнала

★

„Полымя рэвалюцыі“
№№ 1, 2 і 3

★

Перад намі тры нумары журнала «Полымя рэвалюцыі» за 1941 год. Змешчаны спелыя і досыць багатыя ў мастацкім сэнсе творы, грунтоўныя крытычныя артыкулы. Смялей пачалі выступаць маладыя празаікі. Сярод празаічных твораў мы сустракаем цікавую аповесць М. Паслядовіча «Магістральны канал», апавяданні Ц. Зарэчнага, В. Кандрацені, А. Беляніча ва.

Але, найлепшым дасягненнем журнала трэба лічыць паяўленне на яго старонках новай паэмы Якуба Коласа «На крэсах усходніх». У паэме дзейнічаюць тыповыя прадстаўнікі беларускага народа ў асобе Данілы і Марыны, панскія паслугачы і найміты, як Богут, ды людзі іншых сацыяльных праслоек.

Дзеці батракоў Даніла і Марына, ажаніўшыся, «мараць зажыць па-людску», пабудаваць «новы дом», каб не шукаць прытулку пад страхой Сымона-бабыля. Батрачка Марына яшчэ ў маленстве засталася без бацькоў, зведала жахі імперыялістычнай вайны, згубіла адзінага брата. Выпадак збліжае яе з Данілам, гэткім-жа, як і яна, батраком. Непрыгляднасць жыццёвых умоў не разгубіла маладых. Яны вераць у свае сілы, здольны перамагчы ўсе нягоды. Маленькае дзіця, нібы сонечны прамень, асвятляе змрочную хаціну, поўніць сэрцы бацькоў верай у будучыню. Сын — іх адзіная радасць. І гэта найлепш выражана ў размове Марыны са сваім родным «цельпучком кірпатым».

Ну-ну, не плач! Ну, не крывіся:
Ты-ж маладзец, мужчына ты,
Маладзічок мой залаты!
Унь жыжа свеціць, падзівіся.

Колькі сардэчнасці ў гэтых словах і як трапна малююць яны характар самой маці — тыповай беларускай жанчыны!

Зусім па-інакшаму ствараецца аўтарам вобраз Богута. Апошні ўстае перад чытачом у гратэскным, сатырычным плане. Гэта «павук, што лістам сцеле перад панам, перад панамі гнецца ў крук», які «гатоў сарваць чужы кусок», а «свайго не ўпусціць ні на цалю».

Значнае месца ў паэме займаюць лірычныя адступленні, якімі так перасыпаны ранейшыя паэмы Я. Коласа «Сымон-музыка» і «Новая зямля». Так, чацверты раздзел паэмы прысвечан успамінам аб даўно прайшоўшых днях маленства, юнацтва, якія ўяўляюцца зараз паэту «як недасяжны млечны шлях, дзе свеціць зорак журавіны». Паэт па-новаму асэнсоўвае свой жыццёвы шлях і заканчвае адступленне ўзнёслым зваротам да сваёй радзімы:

І ці гадаў я, што ступлю
Сапраўды ў новую зямлю?
Шчаслівa-ж будзь мая краіна!

Пакуль яшчэ цяжка меркаваць, як складуцца жыццёвыя варункі дзеючых асоб гэтага грандыёзнага эпічнага палатна, але адно ясна, што «Полымя рэвалюцыі» выступіла з сапраўдным паэтычным творам.

Лірыка ў гэтых нумарах журнала прадстаўлена вершамі Ф. Пестрака, М. Танка, П. Панчанкі. І на гэты раз прыгажэй за ўсіх выступіў П. Панчанка. Яго верш «Маці» — адзін з лепшых у беларускай паэзіі на гэту тэму. Характэрны для Панчанкі мяккі лірызм у спалучэнні з прастатой вобразных сродкаў, кампазіцыйнай закончанасцю твора робяць гэты верш надзвычай абаяльным. Горш апрацаван паэтам верш «Параненьі». Матывы, пакладзеныя ў яго аснову, можна сустрэць у многіх рускіх і нават беларускіх паэтаў. Калі-б аўтар знайшоў свежы сюжэт і з аднолькавай сілай напісаў усе радкі, мог-бы атрымацца цікавы твор. Нажаль, у вершы гэтым побач з мясцінамі, зробленымі з сапраўдным мастацкім густам, накшталт:

Прыхіну я галаву да цёмнай ночы:
Хай асыпаць мае скроні зоркі...

сустракаюцца такія цягучыя, залішне метафарычныя радкі, як:

Горача. Балюча. Адчуваю—
Плавяцца зямля і жвір пад сэрцам
Корчыцца у сударгах, жывая (?).
І трава шапоча мне аб смерці (!).

М. Танк выступіў на гэты раз досыць няроўна. У яго вершах побач з добрымі радкамі пракідваюцца радкі кволістыя, рытарычныя ў сваёй аснове, пазбаўленыя ўласцівай для гэтага таленавітага паэта свежасці вобразаў, як:

Твой зорны шлях ў даль прамянее,
Не зарасці яму трысцём.

Найбольш няўдалых мясцін у яго вершы «Дарога», увогуле нядрэнным. Паэт гаворыць аб кавыльнай раўніне, аб калгасным абозе з хлебам, і раптам да свежых радкоў далучаюцца нязграбныя па гучанню: «І Дон над ёй ледзь цецівой спягнуў лук неба сіні». Атрымліваецца нейкае новае словазлучэнне «лецецівой».

Ф. Пестрак у сваім вершы пайшоў па лініі агульнага выражэння сваіх пачуццяў, ужываючы пры гэтым вандруючыя з верша ў верш вобразы: «акорды струн», «трывога ціхая», «расцвіла зямля», «сурмай баявой», «быт далёкі і глухі» і інш.

Новую аповесць М. Паслядовіча, хоць яна і разлічана на чытача школьнага ўзросту, са здавальненнем прачытаюць і дарослыя. У аповесці ярка выражана жыццё калгаснай вёскі, і адлюстравана яно не груба, а праз дэталі, праз дыялагі дзеючых асоб, хоць у цэлым твор не пазбаўлен кампазіцыйнай рыхласці і ў многіх месцах—павярхоўнага паказу калгасных будняў.

Паслядовіч знайшоў сваіх герояў, не падобных на герояў іншых кніг. Найбольш удаліся яму вобразы дзеда Брыля, Мечыка і ў значнай ступені Івана Сарокі. Безумоўнай удачай пісьменніка трэба лічыць вобраз Мечыка, дзейснага, цікаўнага і вынаходлівага школьніка.

Некалькі слоў трэба сказаць аб мове твора. Паслядовіч прыкметна пазбавіўся адстаяўшыхся ў літаратуры шаблонаў. Пейзаж у яго жывы, жыццёрадасны, пейзаж новай калгаснай вёскі, дзе трэба— суровы, а часцей лірычна-усхваляваны.

Трэба адзначыць, што за апошнія годы ў нашай літаратуры значна вырасла культура пейзажу. Аб гэтым сведчыць не толькі аповесць М. Паслядовіча, але і апавяданні Ц. Зарэчнага, В. Кандрацені і інш.

Ц. Зарэчны за апошні год праявіў сябе як добры навеліст. Яго «Бусляне» і «Шчасце» — бадай лепшыя творы з надрукаваных ім у рэцэнзіруемых нумарах журнала. Людзі ў гэтых навелах дзейнічаюць, іх характары развіваюцца ва ўзаемадачыненні з акружаючым калектывам. Прырода тут толькі фон для стварэння псіхалагічных эцюдаў. Але не ўсюды Зарэчнаму ўдаецца пазбавіцца лішніх, надакучыўшых ужо вобразаў. Хвою ён па традыцыі параўноўвае з паненкай, дубок («малады, каранасты») упадабляецца хлапцу, які прыйшоў на спатканне да дзяўчыны. Лірычнае адступленне, прысвечанае апісанню бора, прыкладненню звяроў перад дубам, што «стаіць як вартавы», хоць і зроблена з густам, але з'яўляецца лішнім. Аднак, гэтыя дробязныя няўдачы не зніжаюць пазнавальнасці апавяданняў Зарэчнага, іх мастацкіх якасцей.

Апавяданне В. Кандрацені «Мая сястра» нагадвае хутчэй лірычны верш у прозе. Многа цеплыні ўклаў аўтар у створаны ім вобраз Марысі. Асабліва цікава паказан вясельны абрад. Дасканала, скарыстоўваючы вобразы народных песень, апісвае аўтар провады мужчын на вайну «ва славу» Жэчы Паспалітай, а затым прыход чырвоных войск. Не шкодзіла-б толькі больш грунтоўна выпісаць характары, паводзіны герояў. Цмяна паказан у апавяданні арышт Аляксандаркі, расплывчата дадзен вобраз яго бацькі Міхаля.

У аснове другога апавядання Кандрацені — «Генерал» ляжыць дробязная інтрыга. Селянін Іван чакае да сябе на начоўку чырвоната генерала, але апошняга адводзяць да яго суседа, а ў Івана начуе шофер, якога ён і прымае за генерала. Іван не дае веры, што такі малады чалавек можа мець гэткі вялікі чын. Хутка высвятляецца памылка, і Іван шкадуе, што віной непаразумення з'яўляецца ён сам. І хоць аўтар спрабуе псіхалагічна выратаваць вобраз Івана, усё-ж дробязнасць самога факта абмежавала аўтара і не дала яму магчымасці стварыць цікавы вобраз заходнебеларускага селяніна, які пры Савецкай уладзе зажыў поўнакроўным жыццём.

Горшымі творамі ў журнале трэба лічыць апавяданні М. Ільінскага. Прачытаеш іх і адчуваеш сябе так, нібы з'еў недаспелую антонаўку і на зубах выступіла аскоміна. Найбольш слабым трэба лічыць яго апавяданне «У летнюю ноч». У ім пераважаюць рытарычныя выразы, не ў меру «паэтычныя» фразы. Толькі на адной старонцы сем разоў ужыта слова «ворагі», некалькі разоў словы «крычыць», «цішыня». Ворагі ў Ільінскага «пачварныя», «крыважэрныя», «як сам мор няўлоўныя», «пачварлівыя ў сваёй нягожай нагаце». Усё апавяданне перасыпана зросшыміся словамі-кантэкстамі, як «малінавы веер зары», «матчыны—цёплыя абдымкі», «халодны гнеў нянавісці», «цемра цёплая і пяшчотная» і інш.

Больш добрасумленна напісана апавяданне «На дачы». У ім нядрэнна паказаны птушкі, але чалавека зноў-такі не відаць. Гэта хутчэй стылізаваны газетны расказ пагранічніка. Адсутнасць глыбокага паказу жыцця характэрна і для апавядання «Залом», хоць і напісана яно на свежую і цікавую тэму.

Асобна стаяць апавяданні «Прыгожы чалавек» і «Белыя грыбы» маладога празаіка А. Белянічава. У першым ёсць зусім нядрэнныя мясціны; напрыклад, трапна паказана спатканне старшыні калгаса Максіма Агарэнкі з брыгадзірам жаночай трактарнай брыгады Аняй. Адчуваецца характэрнае для ранейшых апавяданняў гэтага аўтара імкненне знайсці свой прыём будовы сказа. Увогуле-ж апавяданне напісана схематычна.

З крытычных матэрыялаў, змешчаных у трох нумарах журнала, вылучаюцца сваёй сур'ёзнасцю артыкулы Я. Шарахоўскага — «Аб беларускай паэзіі», А. Кучара — «Сустрэчы сяброў і ворагаў», І. Гутарава — «Ленінска-сталінскі этап у навуцы аб літаратуры», Р. Рубінай — «І. Л. Перац», Ю. Дворкінай — «Пейзаж у творчасці Эд. Самуйлёнка» і інш.

Праца Е. Янкелевіча аб П. Тычыне носіць папулярызатарскі характар. Няма ў ёй свежых аўтарскіх думак аб выдатным украінскім паэту. Нават цытаты з твораў Тычыны аўтар ужывае вядомыя, якія можна сустрэць амаль у кожнай працы пра Тычыну. Напісан артыкул павярхоўна, а хацелася-б прачытаць у журнале капітальную і самастойную працу на гэту тэму. Увогуле-ж змяшчэнне артыкулаў аб творчасці лаўрэатаў Сталінскай прэміі трэба практыкаваць і надалей.

Не могуць задаволіць чытача і артыкулы М. Клімковіча і Ю. Дворкінай аб беларускай прозе. Мэтазгодней было-б не даваць у журнал стэнаграм паасобных дакладаў аб прозе, а на аснове гэтых матэрыялаў зрабіць адзін аб'ектыўна правільны артыкул, у якім прынцыпова разглядзець творчасць як старэйшых нашых празаікаў, так і маладых, хаця-б за кошт «праблематычнай» часткі артыкулаў Клімковіча і Дворкінай, паколькі тут абодва аўтары паўтараюць адзін другога.

Доўгі час у журнале адсутнічаў аддзел бібліяграфіі. У першых нумарах за гэты год змешчаны добрыя рэцэнзіі І. Плашчынскага на зборнікі вершаў Н. Тарас і П. Панчанкі, М. Ларчанкі на «Хлопчык з-пад Гродна» З. Бядулі і інш.

Хочацца зрабіць некалькі агульных заўваг. Як гэта ні крыўдна, але ў журнале недастаткова адводзіцца месца маладым пісьменнікам, асабліва паэтам. За апошнія два-тры годы вырасла цікавае паэтычнае пакаленне: Л. Гаўрылаў, А. Бурдзель, П. Прануза, І. Элькінд, К. Кірыенка і шмат іншых. Яны напісалі і пішуць зусім нядрэнныя вершы. Але «Полымя Рэвалюцыі» чамусьці амаль не змяшчае іх вершаў.

Нарэшце, час адвесці на старонках журнала месца артыкулам па марксісцка-ленінскай тэорыі і крытыцы, нарысам з жыцця нашай краіны: аб героях працы, аб знатных людзях, нарысам з гісторыі нашай радзімы і гісторыі літаратуры, у прыватнасці.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на якасць змяшчаемых твораў. Некаторыя з іх адзначаны слядамі спешкі, недапрацаванасці. Мы маем на ўвазе апавяданні М. Ільінскага і М. Цэлеша.

Н. СУРНАЧОЎ.



Гастролі Одэскага тэатра рэвалюцыі. Сцэны з спектакля «Вялікі выйгрыш» Шолам-Алэйхема. Злева — заслужаны артыст УССР **А. Крамарэнка** ў ролі Шымене Сарокера, справа — заслужаны дзеяч мастацтваў УССР **Л. Мацієўская** ў ролі Эці-Мені.
Фота І. Каплінскага.

ГУТАРКА ПАНА З СЕЛЯНІНАМ

З архіва Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР

У адной з архіўных калекцый у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук БССР захоўваецца дакумент, які выклікае значную цікавасць даследчыкаў. Гэта ананімны твор, напісаны лацініцай на сакавітай беларускай народнай мове. Дакумент не мае даты, але на падставе некаторых даных, а іменна: аналізу паперы, на якой ён напісан, пісьма і некаторых асаблівасцей у тэксце, яго трэба аднесці да канца XVIII альбо да першых гадоў XIX стагоддзя. Дакумент мае польскі загаловак, які ў перакладзе азначае: «Гутарка падарожніка з селянінам». Змест яго ўяўляе дыялаг — гутарку падарожнага пана з выпадкова сустрэтым селянінам.

Адказы селяніна на пытанні пана з'яўляюцца ўзорамі народнай мудрасці, дасціпнасці і іроніі. На кожнае пытанне пану даецца трапны, поўны гумару адказ, які б'е пана па галаве, як молатам. Пан віхляе, пераскаквае з адной тэмы на другую, але яго праціўнік не такі прастак, каб паддацца на ўлоўкі. Часам селянін прыкідваецца дурнаватым, нічога не разумеючым, але гэта толькі манеўр, за якім следуе больш моцны ўдар.

Селянін здзекуецца так са сваёй афяры-пана, пакуль, нарэшце, не кладзе яго на абедзве лапаткі.

Прыводзім дакумент у беларускай транслітэрацыі, захоўваючы асаблівасці мовы, але апускаючы некаторыя месцы, вельмі трапныя і дасціпныя, толькі занадта «сакавітыя», каб друкаваць іх.

**
*

«— Зкёнд ты мужык?
— З хаты, мосьпане.
— Чый-жэ ты?
— Жончын.
— Якога ты пана?
— Гетакага, як і ты, ваша... мужыкоў у... паліць, аж дым курытца.
— Пад кім ты, мужык, жыеш?
— Пад богам, мосьпане.
— Але як твой пан завецца?
— Як быў нежанаты, так звалі панічом, а як ажаніўся — так ужо яго мосьць.
— Каго ты, мужык, слухаіш?
— Дуды, скрыпкі, як зайграюць.
— А каго ты баісся?
— У лесе ваўкоў, а ў сяле сабак.
— Гдзе-ж твая хата?
— Процiў ліха на ўзгорку, гдзе ўбогі згубіў торбу парожню.
— А хто ў вас за ўрадніка? Пан акоман(!)? А хто-ж за намесніка?
— Той паніч, што пахаджаіць з вялікім бізуном.
— А калі ў вас, мужык, вялікдзень?
— У Пятроўку, калі хлеба нямаш.

. . . .
. . . .

— Што ты вязеш?
— Што ў воз улажыў, то я вязу.
— Што ты будзіш прадаваць?
— Што людзі будуць таргаваць, то я буду прадаваць.
— Чы барана?
— Не, не варона.
— Чы ты, мужык, глупы, чы глухі?
— Што?
— Чый-жэ гэта ў цябе конь?
— Чы ты, ваша, не відзіш, гэта кабылін сын.
— Не ўчарайшы*) ты, мужык?
— Не ўчарайшы, ужо мне сорак год мінула, як радзіўся.
— А чы ўмееш ты пацеры?
— Чорт-бо за іх стаяў, каб умею.
— Чы бываеш ты, мужык, у касцёле?
— Быў раз, як хрысціўся — кумы ўнясліі, другі раз, як жаніўся: сваты ўвялі, а трэці раз сабакі як апанавалі, так я ледва ў касцёл умкнуў.
— Што-ж там людзі робюць?
— Касляюць.
— Што-ж ксёндз робіць у касцёле?
— Ат, з хлопцам**) усё спіраітца: піраксім, непіраксім, піраксім, непіраксім.***)
— Чы знаіш ты, мужык, катэхізм?
— Чаму я катоў не знаю, у нас у сяле каты ўзімку па ўглам лазюць.
— Чы знаіш ты бога?
— Знаю, да бог не такі, як ты, дурак.
— За што-ж ты мяне лаіш?
— Ты, ваша, выбачай, бо мая такая гутарка».

---

*) Вар'ят.
**) Памочнік ксяндза пры набажэнстве.
***) Перакручаныя словы лацінскай малітвы.

Прыведзены дакумент з'яўляецца ўзорам сапраўднай народнай творчасці. Жанр дыялагу вельмі распаўсюджан у беларускім фальклоры. «Гутарка» паміж панам і мужыком знаёма і яўрэйскаму фальклору. Можна знайсці паралелі і ў старажытных усходніх легендах, прыклад — гутарка селяніна з Саламонам Мудрым, паядынак паміж здаровым, практычным розумам і агульнапрызнанай мудрасцю цара Саламона. Пераможцам выходзіць селянін — сялянскі розум пераматае царскую мудрасць.

Але прыведзены дакумент асобна вылучаецца між усіх вядомых твораў падобнага роду. У ім асабліва ярка выступаюць сацыяльныя матывы. Дакумент гэты адлюстроўвае адносіны сялянскіх мас да акружаючай іх рэчаіснасці: нянавісць да феадальнага ладу, да пана, іранічныя і насмешлівыя адносіны да рэлігіі і духавенства. У адказах селяніна выражана таксама горкая доля сялянства, яго беднасць і галеча. У гэтым асноўная каштоўнасць дакумента.

Аднак, сацыяльныя матывы не вычэрпваюць значэння гэтага выдатнага твора. Магчымасць прыстасавання дакумента да пэўнай эпохі робіць яго ў значнай ступені гістарычным помнікам. Нарэшце, дакумент гэты ўяўляе сабою вялікую цікавасць з філалагічнага пункту погляду, як узор беларускай народнай мовы на рубяжы XVIII і XIX стагоддзяў.

З. ХОНІК.

Беларуская сімфанічная музыка

★ Б. Смольскі ★

У маі гэтага года ў Ленінградзе адбыўся пленум аргкамітэта Саюза совецкіх кампазітараў СССР, прысвечаны праблемам совецкага сімфанізма. Удзельнікі пленума пазнаёміліся з радам выдатных сімфанічных твораў Мяскоўскага, Шастаковіча, Хачатур'яна, Пракоф'ева, Шчэрбачова, а таксама з сімфанічнай, камернай і вакальнай творчасцю кампазітарскай моладзі Ленінградскай кансерваторыі.

Праблемы совецкага сімфанізма прыцягнулі ўвагу ўсёй музычнай грамадскасці Совецкага Саюза. На пленуме былі прадстаўлены кампазітары, крытыкі і музыказнаўцы ўсіх 16-ці саюзных рэспублік. Беларуская дэлегацыя была прадстаўлена лаўрэатам Сталінскай прэміі кампазітарам А. В. Багатыровым, кампазітарамі Н. І. Аладавым, Е. К. Цікоцкім, Н. Падкавыравым і аўтарам гэтых радкоў.

Велізарныя поспехі совецкай сімфанічнай музыкі атрымалі шырокае і ўсеагульнае прызнанне не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Апладатвораная багаццем і разнастайнасцю нашага цудоўнага жыцця і пранікнутая новым соцыяльным светапоглядам, сімфанічная музыка, як і ўся совецкая музычная творчасць, уступіла ў перыяд свайго росквіту. Вось чаму пленум аргкамітэта Саюза совецкіх кампазітараў СССР, прысвечаны праблемам совецкага сімфанізма, трэба прызнаць надзвычай актуальным і важным.

Совецкая сімфанічная музыка надзвычай багатая і разнастайная, яна налічвае рад высокамастацкіх твораў, глыбокіх па зместу, манументальных па маштабах, насычаных магутным драматызмам (рад сімфоній Мяскоўскага, 5-я сімфонія Шастаковіча і інш.), натхнёнай лірыкай (21-я сімфонія Мяскоўскага, фортэп'янны квінтэт Шастаковіча). З другога боку, у нас за апошні час створаны творы манументальна-эпічнага складу, у якіх увасабляецца гістарычны лёс цэлых пакаленняў, дадзены карціны самаадданай народнай барацьбы. Да такога тыпу совецкага сімфанізма адносяцца сімфонія-кантата Шапорына «На полі Куліковым», кантата Пракоф'ева «Аляксандр Неўскі» і араторыя Коваля «Емельян Пугачоў».

Патрыятычная тэматыка двух першых твораў і народныя вобразы трэцяга абуджаюць грамадскую свядомасць, пачуццё любві да гераічнага мінулага рускага народа, заклікаючы кампазітараў да стварэння высокаталенавітых твораў на сучасную тэматыку, такіх, як «Паэма аб Сталіне» Хачатур'яна, сімфонія «Памяці С. М. Кірава» Мурадэлі і іншыя.

Выключная цяга совецкіх кампазітараў да сімфанізма, да майстэрства высокага музычнага мыслення, вялікай ідэйна-філасофскай глыбіні з'яўляецца зусім законамернай. Іменна ў галіне сімфанізма ярчэй за ўсё сказаліся поспехі совецкага музычнага мастацтва, што пацвердзілася фактам прысуджэння Сталінскіх прэмій значнай групе кампазітараў-сімфаністаў (Мяскоўскі, Шастаковіч, Кіладзе, Рэвуцкі). Совецкі сімфанізм мае зараз сусветна-гістарычнае значэнне, і гэта абавязвае нашых кампазітараў ствараць новыя творы, вартыя вялікай сталінскай эпохі.

Праслуханыя ўдзельнікамі пленума сімфанічныя і камерныя творы маладых ленінградскіх кампазітараў пакідаюць жадаць шмат лепшага. Пры наяўнасці высокага прафесіянальнага ўзроўню, пры адсутнасці прымітывізму, у гэтых творах няма ўсё-ж вялікіх, глыбокіх мыслей, адсутнічаюць мужныя, гераічныя інтанацыі. Праўда, у іх шмат лірычнасці, часам задушэўнасці, эмацыянальнасці, але ці-ж у нашым яркім, поўным унутранай дынамікі і гераікі жыцці нельга знайсці баявых драматычных тэм для ўвасаблення ў сімфанічным творы?

Ленінградская моладзь у асобе кампазітараў Еўлахава, Клюзнера, Свірыдава, Хачурава, Гольца і іншых мае высокаадораных людзей, але ўсім ім трэба праявіць большую самастойнасць, адыйсці ад знешняга пераймання Шастаковіча, знайсці сваю, індывідуальную музычную мову, увасабляць у сваёй музыцы тыя вялікія гістарычныя падзеі, якія вырашаюцца совецкім народам і патрабуюць вялікага гераізму і мужнасці як у жыцці, так і ў мастацтве.

Другім недахопам некаторых праслуханых твораў з'яўляецца адсутнасць у іх народных мелодый, што стварае ўражанне адарванасці іх ад якой-бы там ні было нацыянальнай музыкі, г. зн. можна гаварыць аб некаторай абстрактнасці музычнай мовы, адарванасці разважанняў кампазітараў ад рэчаіснасці. Перад маладымі ленінградскімі кампазітарамі стаіць вялікая задача, якую неабходна вырашыць для таго, каб выйсці на шырокую дарогу совецкага сімфанізма.

* * *

Выязныя пленумы аргкамітэта Саюза совецкіх кампазітараў СССР, якія адбыліся ўжо ў Тбілісі, Кіеве, Ленінградзе, адыгралі выключна вялікую ролю ў развіцці нацыянальнай грузінскай і украінскай музыкі, у творчасці ленінградскіх кампазітараў. Чарговы пленум мяркуецца правесці ў Ерэване, а ў будучым годзе — у Мінску.

Беларускім кампазітарам ўжо зараз трэба сур'ёзна абмеркаваць план сваіх будучых творчых работ, па-сапраўднаму ўзяцца за стварэнне эпічнай, камедыйнай сімфоніі, моцна змагацца за гераічны сімфанізм, сімфанізм барацьбы, і пачаць падрыхтоўку да надыходзячага паказу сваіх твораў кампазітарам і крытыкам Совецкага Саюза. У апошнім пытанні павінна быць востра зацікаўлена Дзяржаўная філармонія БССР, адзіная ў нас музычная арганізацыя, якая здольна па-сапраўднаму высокамастацка ажыццявіць выкананне твораў. На вялікі жаль, філармонія вельмі мала робіць для папулярызацыі беларускай сімфанічнай музыкі. Гэты сур'ёзны недахоп прадэманстрыраван толькі-што закончыўшымся канцэртным сезонам сімфанічнага аркестра. Хочацца верыць, што будучы сезон філармоніі будзе мець у сваіх праграмах рад сімфанічных твораў беларускіх кампазітараў, а музычны аддзел Упраўлення па справах мастацтваў сур'ёзна возьмецца за прапаганду беларускага музычнага мастацтва.

Беларуская сімфанічная музыка па сваёй накіраванасці, тэматыцы арганічна звязана з усім совецкім сімфанізмам і развіваецца як жанр на прынцыпах глыбока рэалістычных, адлюстроўваючы наша жыццё ва ўсёй яго разнастайнасці. Яна ўжо налічвае рад выдатных твораў, глыбокіх і змястоўных па тэматыцы і разнастайных па форме. Сюды ў першую чаргу трэба аднесці 2-ю сімфонію, сімфанічную паэму «Мацней за смерць», фантазію «Дума пра пагранічніка Лагоду» Аладава, сімфоніі Залатарова, 2-ю сімфонію Цікоцкага і інш.

Амаль усе кампазітары БССР у той ці іншай ступені працуюць у галіне стварэння буйнай сімфанічнай формы. Такая інтэнсіўная работа ў галіне сімфанізма тлумачыцца значымасцю жанру, яго ідэйна-філасофскай сутнасцю, а таксама яго вядучым месцам у фарміраванні совецкай музычнай культуры.

У беларускай музыцы ўмацоўваюцца і развіваюцца розныя жанры сімфанічнай драматургіі: драматычны, лірыка-маналагічны і часткова эпічны. Мне здаецца, што найбольш значным, вядучым сімфанічным жанрам з'яўляецца сімфанізм драматычны, сімфанізм барацьбы (сімфонія і сімфанічная паэма «Мацней за смерць» Аладава, сімфоніі Залатарова і Цікоцкага). Але самым распаўсюджаным і больш папулярным можна лічыць сімфанізм лірычны, сімфанізм суб'ектыўна-псіхалагічнага плана. У гэтым пераконваюць нас сімфоніі Багатырова, Падкавырава, Шчаглова, Самохіна, Пукста і інш. Нельга, вядома, адмаўляць драматычныя моманты ў сімфоніях асобных кампазітараў, скажам, Багатырова, Падкавырава, але асноўным іх лейтматывам з'яўляецца лірычны пачатак. Гэты тып сімфанізма атрымаў шырокае распаўсюджанне не толькі ў аркестровай, але і ў опернай і камернай музыцы (опера «У пушчах Палесся» і трыо Багатырова, опера «Міхась Падгорны» Цікоцкага, квартэт Чуркіна і г. д.).

Значнае месца ў творчасці беларускіх кампазітараў займаюць творы дывертысментнага характару, у якіх шырока выкарыстаны народныя песні і танцы. Гэты раздзел уключае самыя разнастайныя формы выкладання: сюіту, фантазію, сімфаньету, капрычыё і г. д. Найбольш плённа працуюць у гэтай галіне Аладаў, Залатароў, Туранкоў, Пукст і Шчаглоў. Лепшымі творамі дывертысментнай музыкі можна лічыць сімфаньету і капрычыё Аладава, фантазію і сюіты Залатарова, сюіту Туранкова. Сюды-ж можна аднесці і сюіту Шчаглова, у якой удала і каларытна апрацаваны беларускія народныя песні. Радаснай з'явай трэба прызнаць спробу даць музычную сатыру ў шырокім сімфанічным плане («Зары насустрач» Аладава).

Жанр жыццёрадаснай камедыйнай, гумарыстычнай сімфоніі адсутнічае ў нас, хоць прадпасылкі для яе стварэння ёсць. Элементы весялосці, гратэску, часткова гумару, мы можам знайсці ў уверцюры Аладава «Даёш», у трэцяй частцы сюіты Туранкова, але ўсяго гэтага вельмі недастаткова. Перад беларускімі кампазітарамі стаіць задача — на падставе вясёлай, жыццёрадаснай, жартаўлівай народнай песні стварыць жанр камедыйнай, поўнай жыццёрадаснага гумару сімфоніі.

Жанр эпічнай сімфоніі, які знайшоў сваё яркае ўвасабленне ў рускай музычнай культуры XIX стагоддзя, у творчасці Барадзіна (1-я і 2-я сімфоніі, опера «Князь Ігар»), павінен знайсці пачэснае месца і ў творчасці беларускіх кампазітараў. Нельга, вядома, гаварыць, што ў нас зусім адсутнічаюць элементы эпічнасці. Мы іх можам знайсці ў некаторай ступені ў творах, прысвечаных чэлюскінскай эпапеі (сімфанічныя творы Залатарова, Аладава, Туранкова).

Творцамі першых беларускіх сімфанічных твораў з'яўляюцца кампазітары Чуркін і Цікоцкі. Сімфаньета Чуркіна, якая носіць назву «Беларускія малюнкі», была напісана ў 1924 годзе; яна прасякнута простадушнай весялосцю і ўгрунтавана на папулярных беларускіх народных тэмах. Па характару свайго развіцця і распрацоўцы матэрыялу яна хутчэй нагадвае аркестровую сюіту. 2-я сімфонія Цікоцкага, закончаная ў 1926 годзе, больш сімфанічная па распрацоўцы матэрыялу, вылучаецца некаторай знешняй эфектнасцю і стылістычным разнабоем. Гэтыя два творы маюць пэўнае гістарычнае, а часткова і мастацкае значэнне ў стварэнні беларускай сімфанічнай музыкі.

Найбольш плённа ў галіне сімфанічнай музыкі працуе Н. Аладаў, адзін са старэйшых беларускіх кампазітараў, які па сутнасці з'яўляецца творцам беларускай сімфанічнай музыкі ў яе высокім прафесіянальным значэнні. Асноўныя рысы стылю Аладава — яркая вобразнасць, разнастайнасць і багацце жыццёадчування, дынамічнасць, драматызм і высокі прафесіянальны ўзровень. Ствараючы свой уласны, глыбока індывідуальны стыль, Аладаў развівае і ўзбагачае стыль беларускай нацыянальнай музыкі. Сімфанічная творчасць Аладава глыбока разнастайная па сваіх формах. Яна складаецца з двух сімфоній, сімфанічнай паэмы «Мацней за смерць», двух фантазій — «Дума пра пагранічніка Лагоду» і «Чэлюскінская эпапея», уверцюры-фантазіі «Зары насустрач», сімфаньеты, капрычыё і раду іншых твораў. Не ўсе гэтыя творы аднолькавыя па свайму зместу, затое на ўсіх іх ляжыць адбітак высокай прафесіянальнай культуры. Цэнтральнымі і найбольш выдатнымі сярод іх з'яўляюцца: 2-я сімфонія на беларускія тэмы, прысвечаная 8 сакавіка, сімфанічная паэма «Мацней за смерць» і фантазія «Дума пра пагранічніка Лагоду». Усе гэтыя творы вылучаюцца значнасцю тэмы майстэрствам, драматычнай сілай, вынаходлівасцю і сапраўдным сімфанічным развіццём.

Даволі актыўна працуе ў галіне беларускай сімфанічнай музыкі вучань Рымскага-Корсакава В. Залатароў — адзін са старэйшых кампазітараў Совецкага Саюза. Ім напісаны дзве сімфоніі: «Чэлюскінцы» і «Вызваленне», фантазія на беларускія тэмы, сюіта «Кантрасты», танцавальная сюіта, некалькі уверцюр і інш. Залатарова, як і Аладава, характарызуе высокі прафесіянальны ўзровень яго творчасці, закончанасць формы і вялікае паліфанічнае майстэрства.

Досыць інтэнсіўна працуе ў галіне сімфанічнай музыкі кампазітар Е. Цікоцкі. Нядаўна напісаная ім 2-я сімфонія з'яўляецца значным крокам наперад па шляху авалодання сімфанізмам і можа па-праву быць залічана да раду найбольш значных твораў беларускай музыкі.

З маладых беларускіх кампазітараў, працуючых у галіне сімфанічнай музыкі, трэба прыгадаць Столава, які за два гады свайго прабывання ў Беларусі напісаў сімфанічную паэму, скрыпічны канцэрт, уверцюру, сімфаньету і інш. Столаў дасканала ведае аркестр, мае творчыя даныя і добра валодае кампазітарскай тэхнікай. У яго творах шмат яркасці, каларытнасці, асабліва ў інструментоўцы. Некаторая характэрная для яго імпрэсіяністычная ўтончанасць пачынае паступова знікаць у апошніх творах.

Хочацца прыгадаць маладога аўтара новай беларускай оперы «Як гартавалася сталь» Падкавырава, які ў сваёй 1-й сімфоніі вышуквае свой індывідуальны творчы шлях.

Перад беларускімі кампазітарамі, як і перад усімі кампазітарамі Совецкага Саюза, стаяць кардынальныя задачы стварэння поўнагучных сімфанічных твораў, бо не зважаючы на нашы велізарныя дасягненні, мы не стварылі яшчэ жанру эпічнай і камедыйнай сімфоніі, а жанр драматычнай сімфоніі перажывае ў нас першапачатковую стадыю развіцця. Такім чынам тое, што напісана, можа з'явіцца толькі першымі эскізамі, накідамі, штрыхамі будучых сімфоній.

Сапраўднае мастацтва расцвітае толькі ў нашай краіне, дзе яно знайшло сапраўдную радзіму і дзе яму суджана ў класічна-дасканалых формах выразіць самыя перадавыя, прагрэсіўныя імкненні ўсяго чалавецтва. Перад беларускімі кампазітарамі стаіць задача стварэння першакласных, дасканалых твораў совецкага сімфанізма на нацыянальнай глебе, на аснове беларускай народнай песні, выкарыстоўваючы дасягненні рускіх і украінскіх совецкіх кампазітараў і класічную спадчыну рускага і заходнееўрапейскага сімфанізма.



Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР **А. Бразэр** закончыў скульптурны партрэт дэпутата Вярхоўнага Савета БССР кампазітара А. Туранкова. **На здымку:** т.т. Бразэр і Туранкоў ля закончанай скульптуры.
Фота І. Салавейчыка.

Заметкі аб оперна-балетным сезоне

★ М. Модэль ★

Пошукі новага, творчы непакой не пакідалі Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета БССР на працягу ўсяго мінулага сезона. Былі пастаўлены класічныя оперы: «Чыо-чыо-сан», «Травіята», «Пікавая дама», «Казкі Гофмана», балеты: «Лебядзінае возера», «Дон Кіхот» і выпадковы для тэатра спектакль «Трыльбі».

Самы значны вынік оперна-балетнага сезона — вылучэнне маладых вакалістаў, танцоўшчыкаў на адказныя партыі і самастойная пастаноўка маладымі рэжысёрамі цікавых спектакляў.

Асабліва вызначыліся ў мінулым сезоне рэжысёр О. Барысевіч і балетмейстар К. Муллер.

Ольга Барысевіч паставіла два спектаклі: «Трыльбі» і «Казкі Гофмана». Малады рэжысёр шукаў у гэтых спектаклях рысы опернай тэатральнасці. В. Немiровіч-Данчэнка лічыць, што ў оперным спектаклі трэба «гаварыць са сцэны толькі праўду, але **праўду** не ў натуралістычнай яе сутнасці, а ў прыгожасці яркага абагульнення».



Маладыя артысткі балета, закончыўшыя курс навучання на харэаграфічным аддзяленні Тэатральнага вучылішча БССР і здаўшыя выпускныя экзамены з адзнакай «выдатна». Злева направа: Жэня **Архіпава**, Іра **Крывадубава**, Ніна **Шэлег**.
Фота І. Каплінскага.

Зжываючы са сцэны «вампуку», Барысевіч знайшла сінтэз музыкі і драмы, памятаючы аб прымаце музыкі і вакалу ў оперным спектаклі.

У спектаклях, якія пастаўлены Барысевіч, музыка ўспрымаецца гледачом праз драматычнае перажыванне актора, а драматычнае перажыванне паглыбляецца музыкай.

Барысевіч дамаглася ансамблевасці і злітнасці ўсіх кампанентаў спектакля. Спяваючы хор разам з тым дзейнічае. Мізансцэны — маляўнічыя, натуральныя і жыццёвыя — дапамагаюць акторам-спевакам паўней раскрыць музыкальны змест вакальных партый. Барысевіч дапамагае актору-спеваку «ужыцца» у вобраз і раскрыць музыкальны «падтэкст» партыі.

Опера-меладрама «Трыльбі» Юрасоўскага хіліць да ўмоўных масак «любоўніка», «злодзея», «нявіннай афяры» і г. д. Барысевіч абышла небяспекі, якія хаваліся ў музычна-драматургічнай тканіне оперы і здолела падказаць акторам такую манеру сцэнічных паводзін, якая дапамагае ім добра спяваць і заставацца жывымі людзьмі на сцэне.

Натуральна, што такая рэжысура, пры добрым музычным кіраўніцтве спектаклем дырыжора Н. Грубіна, садзейнічала і акторскім удачам. Замест меладрамы ў спектаклі ўзнікла драма натуршчыцы Трыльбі ў выдатнай вакальнай і сцэнічнай інтэрпрэтацыі Р. Млодэк. Хвалюючы вобраз Свенгалі з вялікім сцэнічным тактам быў створан Мурамцавым і Таланкіным.

Яшчэ лепшыя вынікі дала оперная рэжысура Барысевіч у спектаклі «Казкі Гофмана». Тут Барысевіч разам з Н. Грубіным і мастаком Б. Матруніным дасягнула «прыгожасці яркага абагульнення». Амаль усе акторы знайшлі неабходнае ў оперным спектаклі «сінтэтычнае самаадчуванне». В. Лапін з выключнай мастацкай чуласцю раскрыў ідэйны і паэтычны воблік Гофмана — так, як яны падказваліся яму музыкай і лібрэта. Актор спяваў партыю Гофмана пранікнёна і іграў з надзвычайнай шчырасцю. Абаяльная фігура паэта-рамантыка, створаная Лапіным, запамінаецца надоўга.

Асабліва ўзрадавала гледача ў прайшоўшым сезоне Л. Аляксеева. Яе Марфа ў «Царскай нявесце» недастаткова раскрывала вакальны і драматычны талент артысткі. І ў гэтым вінна была рэжысура спектакля. Росквіт вакальна-драматычнага таленту Аляксеевай мы ўбачылі ў «Травіяце» (пастаноўка І. Шляпянава і В. Шахрай, дырыжор М. Шнейдэрман). Чалавечая драма Віалеты, зняважанай у сваім шчырым каханні, была сыграна Аляксеевай патрасаюча. Непаўторна Аляксеева і ў ролі лялькі Олімпіі. Бездакорная каларатурная тэхніка, чыстата інтанацый, фразіроўкі спалучаюцца ў яе з філіграным сцэнічным майстэрствам. З нецярпеннем чакаем мы паяўлення гэтай цудоўнай артысткі ў партыі Антаніды («Іван Сусанін») у будучым сезоне.

Сапраўдны мастак сцэны пазнаецца не па размерах выкананай ім ролі альбо праспяванай опернай партыі. П. Засецкі добра памятны па незабыўных вобразах Мікіты і Саўкі ў беларускіх оперных спектаклях. У апошняй прэм'еры сезона, выконваючы эпізадычную ролю Франца, ён зноў бліснуў значным камедыйным дараваннем і выключнай музыкальнасцю. Франц — Засецкі пакарыў гледача мяккасцю і цеплынёй вакальнага рысунка партыі, гранічнай вайстрынёй і бліскучай камедыйнай ігрой.

Трыльбі—Млодэк, Віалета і Олімпія—Аляксеева, Франц—Засецкі, Гофман—Лапін, таксама як і навізна рэжысуры Ольгі Барысевіч, — гэта толькі асобныя прыклады таго новага і выдатнага, што створана Тэатрам оперы і балета за прайшоўшы сезон.

З уздымам і натхнёна спявала В. Малькова партыі Чыо-чыо-сан, Трыльбі, Антоніі, С. Друкер — партыю Лізы. М. Дзянісаў, насуперак салодкава-сантыментальнай музыцы, у партыі Жэрмона («Травіята») стварыў глыбока драматычны вобраз.

Мы з радасцю адзначаем паглыбленне лірычнага даравання І. Балоціна, які традыцыйныя партыі «оперных любоўнікаў» напоўніў жыццём, знайшоўшы для кожнага з іх у музыцы, тэксце лібрэта і сцэнічных рухах новыя характэрныя рысы.

З велізарным поспехам выканаў Мурамцаў партыю Ліндорфа-Капеліуса ў «Казках Гофмана», а Арсенка — рад барытонавых партый.

Асобнай увагі заслугоўвае Лазараў, нядаўні харыст, а да гэтага ўдзельнік мастацкай самадзейнасці, якому тэатр замяніў кансерваторыю. Лазараў здзівіў опернага гледача свежасцю свайго голасу ў партыі Міхася Падгорнага. У прайшоўшым сезоне малады саліст з добрым густам спяваў надзвычай складаную для драматычнага тэнара партыю Германа ў «Пікавай даме». Мы гаворым толькі аб спяванні, таму што Лазараў яшчэ зусім малады артыст, якому нестае сцэнічнай культуры. Нельга цалкам задаволіцца вакальным і сцэнічным рысункам вобраза Германа — Лазарава, але ўсё-ж маладым артыстам зроблена надзвычай многа. У поспеху Лазарава немалыя заслугі дырыжора Грубіна і рэжысёра Шахрай.

Не ўсе оперныя спектаклі, пастаўленыя ў мінуўшым сезоне, знаходзяцца на аднолькавым мастацкім узроўні. Мы ўбачылі ў «Травіяце» значна больш самастойнай рэжысёрскай думкі, чым у «Пікавай даме». Бясспрэчны, аднак, агульны ўздым вакальнай і сцэнічнай культуры тэатра, удасканаленне харавога калектыва (хормейстар Бельскі), добрая прафесіяналізацыя аркестра і ўзняцце культуры мастацкага афармлення.

Мінуўшы сезон паказаў, што оперны калектыў і салісты тэатра цалкам падрыхтаваны для пастаноўкі манументальнай оперы Глінкі «Іван Сусанін».

Апошні балетны спектакль сезона—«Дон Кіхот» прайшоў пад знакам пошукаў яркай тэатральнасці і відовішчнасці. «Шэкспір танца» Новер у «Пісьмах аб танцы» пісаў: «Добра створаны балет ёсць жывая карціна страсцей, нраваў, звычаяў, абрадаў і касцюмаў». Спектакль «Дон Кіхот» з'яўляецца жывой карцінай страсцей, нраваў і касцюмаў. Балетмейстар К. Муллер, мастак Б. Матрунін стварылі спектакль, які захапляе яркасцю фарбаў, святочнасцю і вынаходлівасцю фантазіі. Другая назва гэтага балета ў беларускім оперным тэатры—«Вяселле Кітэры»—вынікае з сутнасці спектакля, таму што фабульная сувязь між асобнымі сцэнамі і танцамі вельмі наіўная, і асноўныя героі Сервантэса сталі ў спектаклі другараднымі, статычнымі фігурамі. Ды інакш і не магло быць у балетным спектаклі.

Рытм, рысунак і эмацыянальнасць іспанскіх групавых і масавых танцаў больш за ўсё цікавілі Муллера—рэжысёра і балетмейстара. Тут ён дасягнуў найбольшых удач. Агністасць, страснасць і прыгожыя гарманічныя лініі іспанскіх танцаў—фанданго, хабанеро, мужчынскага танца тарэадораў—сведчаць аб тэмпераменце і багацці балетмейстарскай фантазіі Муллера. Менш арыгінальна класічная танцавальная сцэна дрыяд, якая трапіцца ў яркім карнавале спектакля.

Муллер занава паставіў на вялікай сцэне старыя балетныя спектаклі: «Лебядзінае возера» і «Марная перасцярога». У рэжысуры гэтых спектакляў менш уласнай творчай думкі і больш звароту да класічных пастановак. У «Лебядзіным возеры» зварот да класікаў харэаграфіі быў творчым, паэтычным, а ў «Марнай перасцярозе» ёсць нават асобныя рысы рамесленіцтва. Дала сябе адчуць спешка, з якой ставіўся гэты балет.

Паэтычнасць ёсць ва ўсёй харэаграфічнай тканіне спектакля «Лебядзінае возера», у танцавальных вобразах Одэтты і Зігфрыда, у па-дэ-труа, танцы нявест, у прыгожых і мяккіх лініях танцаў чорных і белых лебедзяў. Спектакль пастаўлен у традыцыі рускай балетнай класікі і ў танцавальнай мове гэтага спектакля многа ад класікаў харэаграфіі — Пеціна і Іванова.

Асаблівасцю балетнага сезона з'яўляецца выступленне поруч з выдатнай балерынай З. Васільевай, майстрамі танца К. Муллерам, А. Нікалаевай, С. Дрэчыным. Н. Майсеенка таксама даравітай моладзі.

Выступленне З. Васільевай у партыі Одэтты было святам для гледачоў і артыстаў. Танец Васільевай тэхнічна віртуозны, класічна строгі і да скульптурнасці рэльефны па свайму рысунку. Пластычнасць, музыкальнасць і апломб у танцы балерыны выключныя. Па і балетныя позы Васільевай — Одэтты адухоўлены і насычаны актыўным, волевым драматызмам.

Незабыўна Васільева ў палёце, дзе яна становіцца «царыцай паветра», жывым увасабленнем стройнасці і цудоўнай лёгкасці. Тэхнічна бездакорныя, бліскучыя балетныя позы Васільевай выяўляюць «імкненне душы» і светаадчуванне Одэтты.

Бездакорны туры Муллера—Зігфрыда ў паветры, прыгожая форма, імклівасць і лёгкасць яго прыжкоў і вярчэнняў. Танец Муллера надзвычай артыстычны. Шкада толькі, што мяккасць і лірызм танца Муллера ў дуэтах з «каралевай лебедзяў» часам пераходзіць у сантыментальнасць і тады Муллер становіцца галантным балетным кавалерам.

З захапленнем і ўздымам танцавала партыі Одыліі, Лізы і Кітэры А. Нікалаева.

У гэтых партыях дэманстрыравала даволі значную танцавальную тэхніку і драматычную ігру салістка балета Н. Майсеенка, якой часам яшчэ нехапае адчування стылю вобраза і ўмення індывідуалізацыі танца ў залежнасці ад характару твора.

У спектаклях «Лебядзінае возера» і «Дон Кіхот» з поспехам выступалі юныя танцоўшчыцы Архіпава, Басінкевіч, Крывадубава, Шэлег, якія ў гэтым годзе закончылі вучобу па класу народнай артысткі БССР З. А. Васільевай на харэаграфічным аддзяленні Тэатральнага вучылішча БССР.

С. Дрэчын—танцоўшчык, які валодае мужным тэмпераментам, сцэнічным абаяннем і ўдзячнай знешнасцю. Партыю Сымона ў балеце «Салавей» Дрэчын выконваў бездакорна. Гэтага нельга сказаць аб партыях, якія ён танцаваў у прайшоўшым сезоне. Выключна даравіты артыст, Дрэчын яшчэ не дамогся тэхнічнага бляску ў танцы і лёгкай камедыйнай ігры ў партыі Колэна. Недастаткова імклівы і тэмпераментны Дрэчын і ў партыі Басіліо («Дон Кіхот»). Заслужаны поспех, якім карыстаецца артыст у гэтых ролях, неабходна аднесці ў значнай ступені за кошт яго добрых прыродных якасцей танцоўшчыка.

Добры тэмперамент і мастацкі густ дэманстрыравала ў характэрных партыях прайшоўшага сезона салістка балета Узунава.

Балет—пераважна мастацтва моладзі. Акторская моладзь Тэатра оперы і балета не можа паскардзіцца на адсутнасць да яе ўвагі ў прайшоўшым сезоне. У вядучых партыях выступіла вялікая група здольнай моладзі. Самай яркай удачы дасягнула маладая артыстка Н. Багданава ў партыі Одэтты. Багданава ачароўвае лірычнасцю і мяккасцю танцавальнай манеры, жаночай адухоўленасцю па і балетных поз, прыгожасцю формы танца. Партыю Одэтты Багданава танцавала захапляюча і натхнёна і ў іншай манеры, чым З. Васільева: без віртуознай тэхнікі і бурнага драматызму выдатнай балерыны, але з непадзельнай шчырасцю і цеплынёй, з мяккай і пранікнёнай уланаўскай інтанацыяй.

Віртуознай тэхнікай і волевым тэмпераментам бліснула Багданава ў эпізадычнай характэрнай ролі Мерседэс («Дон Кіхот»). Танец Мерседэс—Багданавай поўны агню, імклівасці, жаночага хараства і гармоніі ліній.

У балетным трыо, вялікім адажыё «Лебядзінага возера» і ў характэрных танцах «Дон Кіхота» раскрылася дараванне маладых танцоўшчыц: Марцьянавай, Назаравай, Спепанец, Драспель. Кожная з маладых артыстак выявіла ў выкананых партыях свае цікавыя індывідуальныя рысы, якія павінны быць развіты і паглыблены настойлівай творчай працай і вучобай.


Яркай артыстычнай індывідуальнасцю з'яўляецца і малады танцоўшчык Вітольберг.

Мы абмяжоўваем нашы заметкі аглядам толькі некаторых тыповых з'яў мінулага оперна-балетнага сезона. Наша пажаданне —убачыць на сцэне Опернага тэатра ў будучым сезоне новыя оперныя і балетныя творы беларускіх кампазітараў, творы на тэмы нашай гераічнай сучаснасці і яшчэ большы росквіт маладых дараванняў.

Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета БССР мае для гэтага ўсе неабходныя ўмовы.



«Каварства і любоў» Ф. Шылера ў Дзяржаўным Польскім тэатры ... здымках: злева — арт. **Г. Касабуцкая** — Луіза і арт. **Ю. Петрашкевіч** ... нанд; справа — арт. **Я. Вашчэровіч** у ролі Вурма. У цэнтры арт. ... лэдзі Мільфорд.
Фота ...



З новых работ мастака-графіка **Б. Е. Малкіна.** «Зімовы дзень», манатыпія.
Фотарэпрадукцыя І. Каплінската.

Два майстры

Выстаўка твораў заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Абрама Маркавіча Бразэра і мастака Льва Маркавіча Лейтмана — цікавая падзея ў мастацкім жыцці нашай рэспублікі.

А. М. Бразэр, перш за ўсё, скульптар, але на гэтай выстаўцы ён прадстаўлен рысункамі і радам жывапісных работ. Рысункі скульптара заўсёды ўяўляюць значную цікавасць. Тым больш цікавы рысункі Бразэра, якія прадстаўляюць сабою другі, не менш важны бок творчасці гэтага мастака. Рысункі Бразэра, як правіла, выконваюцца такім скупым, дысцыплініруючым матэрыялам, як чарніла, часам туш. Зрэдку ўжываецца аловак і сангіна.

Бразэр добра адчувае аб'ём і форму. Лепшыя яго рысункі вылучаюцца ўменнем знайсці такую форму, якая даходзіць да скульптурнасці (мужчынская галава і інш.). Аперыруючы адным колерам, расцягваючы яго ад глыбока чорнага да белага, мастак лепіць форму, часам некалькі ўтрыраваную, але заўсёды падпарадкаваную задачам псіхалагічнага вырашэння вобраза.

Рад жывапісных работ Бразэра (аўтапартрэт, пейзаж, нацюрморт і інш.) паказваюць, што захапленне фармальнымі задачамі прыводзіць да таго, што аўтар здраджвае сваім творчым прынцыпам—шукае прыгожае не ў рэальных формах акружаючай яго прыроды, а ў манеры пісьма і надуманых каляровых суадносінах.

Л. М. Лейтман — мастак-пейзажыст (па крайняй меры, да гэтага часу ён пераважна працаваў у галіне пейзажнага жывапісу). Улюбёным матэрыялам мастака з'яўляецца гуаш, акварэль, але ў апошні час ён усё часцей і часцей звяртаецца да масляната жывапісу.

У лепшых сваіх работах («Зіма» — масла, «Канец зімы» — гуаш, «Млын на Віцьбе» — гуаш, «Вясна» — гуаш і інш.) Лейтман следуе добрым традыцыям буйнейшага рускага майстра пейзажу І. Левітана. Лейтман ведае і любіць прыроду роднай яму Беларусі, яе тонкія, насычаныя па колеру пейзажы. Ён умее данесці да гледача лірычны настрой шэрага зімовага дня («Зіма»—масла), набліжаючайся вясны («Канец зімы» — гуаш), радасць адчування гарачага летняга дня «(Млын на Віцьбе» — гуаш, «Летні дзень» — гуаш), напружанасць баявых будняў («Пантонная пераправа» — акварэль і гуаш) і г. д.

Да ліку лепшых работ Лейтмана трэба аднесці яго «Зіму» (масла), напісаную ў 1940 годзе і ўпершыню экспанірававаную на выстаўцы выяўленчага мастацтва БССР у Маскве ў часе дэкады беларускага мастацтва. Напісана «Зіма» ў цёплай серабрыста - перламутравай гамме. Гэты пейзаж па свайму эмацыянальнаму ўздзейнічанню і тонкасці жывапісных суадносін набліжаецца да карціны. Мастаку ўдалося перадаць характар і настрой зімовага дня, поўнага танчэйшых каляровых нюансаў. Фізічна адчуваеш гэты лёгкі, прыемны халадок, паветра, напоенае вільгацю, — адчуваеш трапяткое дыханне жыцця. Праўда, некалькі няўдалы матыў (цягне-ж нашых мастакоў да гэткіх заскарузлых куткоў старога горада!) выклікае некаторую дасаду па адрасу аўтара. У гэтай сувязі хацелася-б указаць на тое, што мастакі-пейзажысты часта забываюць аб прыгожасці дакладных архітэктурных форм, не заўважаюць пудоўных архітэктурных пейзажаў нашых гарадоў.

Асобна трэба спыніцца на радзе работ, выкананых мастаком для выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары БССР». Гэтыя работы прысвечаны па сутнасці адной тэме — жыццю і быту байцоў Чырвонай Арміі. Назіранні, часам напісаныя проста з натуры эпізоды і сцэны лагернага жыцця і баявой вучобы радуюць тым, што аўтару ўдалося пазбегнуць штампу, што гэта сапраўды жывапісныя творы. Аднак, недахопы ў рысунку і кампазіцыйным вырашэнні значна зніжаюць мастацкую каштоўнасць гэтых работ.

Мастак ведае свае недахопы ў рысунку і настойліва працуе над іх перамаганнем. Невыпадкова, што ён усё часцей і часцей звяртаецца да партрэта чалавека, які перш за ўсё патрабуе ад мастака ўмення рысаваць. У гэтай сувязі бясспрэчнай удачай Лейтмана з'яўляецца яго партрэт «Дзяўчына ў чорным і блакітным» (гуаш і акварэль, 1941 год).

У заключэнне хочацца ўказаць на тое, што ў творчасці Лейтмана пераважае эцюднасць, што на многіх яго работах ляжыць адбітак недаробленасці, недасканаласці.

Творчасць А. М. Бразэра і Л. М. Лейтмана знаходзіцца ў самым росквіце. Савецкая грамадскасць, радуючыся поспехам гэтых майстроў, управе чакаць ад іх новых творчых дасягненняў.

Д. ГЕНІН.

Да лермантаўскіх дзён

У Беластоку разгарнулася шырокая падрыхтоўчая работа да 100-годдзя з дня смерці М. Ю. Лермантава. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай да юбілея і правядзення лермантаўскіх урачыстасцей створан камітэт пад старшынствам сакратара абкома КП(б)Б тав. Эльмана. У склад камітэта ўваходзяць прадстаўнікі партыйных, савецкіх і грамадскіх арганізацый вобласці: дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР тт. Прытыцкі і Пестрак, батальённы камісар тав. Лешчынер, рэдактар абласной газеты «Вольная праца» тав. Зельманаў, паэты М. Танк, Б. Геллер, крытыкі Д. Сфард, Б. Марк і інш.

У Беластоку будзе праведзен агульнагарадскі вечар інтэлігенцыі, прысвечаны Лермантаву. З дакладам аб геніяльным рускім паэту выступіць Ф. Пестрак.

Пры фабрычна-заводскіх клубах арганізоўваюцца гурткі па вывучэнню творчасці Лермантава. Заняткамі гурткоў кіруюць пісьменнікі, прапагандысты і настаўнікі.

Каштоўныя мерапрыемствы праводзіць абласны Дом народнай творчасці. Ён аб'явіў конкурсы на лепшую інсцэніроўку твораў паэта ў самадзейных калектывах і на лепшы эскіз партрэта Лермантава на тканіне.

Мастакі рыхтуюць выстаўку ілюстрацый да твораў Лермантава. Радыёкамітэт правядзе рад літаратурных перадач на рускай, беларускай, польскай і яўрэйскай мовах.

Беласток.

Падрыхтоўка да юбілея ў Гомелі

Шырока разгарнулася падрыхтоўка да 100-годдзя з дня гібелі М. Ю. Лермантава па гор. Гомелю і вобласці. На прадпрыемствах, у клубах і бібліятэках арганізоўваюцца выстаўкі, прысвечаныя памяці паэта.

Цікавая выстаўка арганізавана гарадской бібліятэкай імя Герцэна. Удала падабраныя фотаздымкі, ілюстрацыі, кнігі расказваюць наведвальнікам аб жыцці і творчым шляху Міхаіла Юр'евіча Лермантава. Рыхтуецца спецыяльны выпуск насценгазеты, прысвечанай Лермантаву. Мяркуецца правесці лермантаўскі вечар.

Такія-ж выстаўкі адкрыты ў чыгуначным клубе імя Леніна, у педагагічным інстытуце і інш.

Аддзел прапаганды гаркома КП(б)Б днямі склікаў спецыяльную нараду бібліятэчных работнікаў горада, на якой было абмеркавана пытанне падрыхтоўкі да юбілея Лермантава.

Г. ПАСТРОН.

Вынікі падпіскі на Пазыку трэцяй пяцігодкі па ССП БССР

Размяшчэнне дзяржаўнай Пазыкі трэ-й пяцігодкі (выпуск чацвертага года) ...йшло ў Саюзе савецкіх пісьменнікаў ...Р на высокім узроўні. Большасць ...меннікаў і служачых апарата ССП ...СР падпісалася на месячны заработак. ...аурэат Сталінскай прэміі народны па... ...ССР Янка Купала падпісаўся на су... ...000 рублёў.

...ковая сума падпіскі па ССП ...адае 77.655 рублёў. Работнікі ...журнала «По[illegible]» і газеты «Літаратура і мастацтва» падпісаліся на 132,1 проц. сваёй месячнай зарплаты, работнікі апарата ССП БССР—на 104,4 проц., работнікі дома адпачынку — на 113 проц., работнікі Упраўлення па ахове аўтарскіх правоў — на 97 проц.

Актыўны ўдзел у арганізацыі падпіскі на пазыку прымалі паэты-ордэнаносцы П. Глебка, П. Броўка і супрацоўнікі апарата т.т. Віленчык і Петрушэнка.

М. МАЗО,
старшыня камсода ССП БССР.

БІБЛІЯГРАФІЯ

Зборнікі рэпертуару для мастацкай самадзейнасці

Ваенным выдавецтвам Народнага камісарыята абароны СССР выпушчаны два зборнікі рэпертуару для мастацкай самадзейнасці: «Чырвонаармейскія песні» і «Чытальнік - дэкламатар».

Зборнік «Чырвонаармейскія песні» заключае ў сабе 75 папулярных патрыятычных і баявых чырвонаармейскіх песень, якія размешчаны ў паслядоўным парадку гістарычнага развіцця і росту Чырвонай Арміі: грамадзянская вайна, баі ля возера Хасан, падзеі пад Халхін-Голам, вызваленчы паход у Заходнюю Украіну і Заходнюю Беларусь, гераічныя баі з белафінамі і г. д. Адкрываецца зборнік «Інтэрнацыяналам», музыка Дэгейтара, затым ідуць: «Гімн партыі бальшавікоў», «Кантата аб Сталіну», Песня аб Кліму Варашылаву» «Песня аб наркому Цімашэнку» кампазітара - ордэнаносца А. В. Аляксандрава. Разнастайнасць прадстаўленага ў зборніку песеннага матэрыялу — твораў вядомых кампазітараў Дунаеўскага, бр. Пакрас, Новікава, Кніппера, Кампанейца і інш. робіць яго адным з лепшых сярод выйшаўшых за апошні час рэпертуарных зборнікаў для харавога і масавага выканання. Зборнік разлічан таксама і ў якасці паўсядзённага дапаможніка для ротных запявал.

У адрозненне ад раней выданых Ваенным выдавецтвам песеннікаў, гэты зборнік выгадна вылучаецца тым, што кожная мелодыя песні надрукавана ў суправаджэнні фортэп'яна ці, па жаданню, баяна.

Зборнік «Чытальнік-дэкламатар» разлічан на непасрэдную дапамогу чырвонаармейскім самадзейным акторам-выканаўцам мастацкага чытання. У «Чытальніку-дэкламатару» матэрыял (вершы і проза) тэматызіраван па раздзелах: «Грамадзянская вайна», «Баявыя будні», «Чырвоная Армія ў баях за сацыялістычную радзіму»; асобны раздзел змяшчае творы на тэму «Царская армія». У гэты зборнік уключаны творы В. Маякоўскага, Д. Фурманава, А. Фадзеева, А. Талстога, акына Джамбула, Матэ Залкі, Б. Левіна, Н. Асеева, Н. Ціханава і інш. Зборнік можа быць выкарыстан як самадзейнымі акторамі — выканаўцамі чырвонаармейскай эстрады, так і чытальнікамі непасрэдна ў чырвонаармейскім асяроддзі.

Сабраны ў двух кніжках песенны і чытальны матэрыял з'яўляецца багацейшай крыніцай падрыхтоўкі праграм мастацкай самадзейнасці, прысвечаных гістарычным датам Чырвонай Арміі. Для чырвонаармейскіх-жа самадзейных калектываў гэтыя выданні будуць служыць абавязковымі і штодзённымі зборнікамі рэпертуару.

Абодва зборнікі паступяць у продаж праз кніжна - гандлёвую сець Ваенкнігагандлю і вельмі пажадана, каб іх набылі прафсаюзныя клубы і культработнікі прадпрыемстваў.

В. МУРАТ.



Вучаніца 1-га класа 27-й сярэдняй школы гор. Віцебска 8-гадовая **Аня Будоўніч** выдатна закончыла трэці год навучання ў Віцебскай музычнай школе. За выдатныя поспехі яна была вылучана для ўдзелу ў фестывалі вучняў музычных школ БССР. **На здымку:** Аня Будоўніч і старэйшы выкладчык Віцебскай музычнай школы па класу раяля Е. Р. Шуман.
Фота І. Лосева. (БЕЛТА).



Мастак П. Сергіевіч

Пражываючы ў Вільнюсе беларускі мастак Пётра Сергіевіч, сын селяніна-бедняка з м. Відзы (зараз раён Вілейскай вобласці), у былой панскай Польшчы шмат год быў беспрацоўным. Талент мастака не заахвочваўся і мастак часта не меў сродкаў для існавання. У 1939 годзе, пасля вызвалення Заходняй Беларусі Чырвонай Арміяй, гор. Вільнюс дружаственным актам Урада СССР быў перададзен Літоўскай рэспубліцы. У буржуазным Вільнюсе застаўся і П. Сергіевіч. Але ненадоўга. Народ Літвы хутка скінуў з сябе плутакратычны рэжым буржуазна-памешчыцкай Літоўскай рэспублікі, абвясціў у Літве Совецкую ўладу і далучыўся да Совецкага Саюза. Тав. Сергіевіч шчыра вітаў нараджэнне Літоўскай ССР.

З устанаўленнем Совецкай улады ў Літве тав. Сергіевічу створаны ўсе ўмовы для разгортвання творчай работы. Ён з'яўляецца сталым супрацоўнікам Беларускага музея ў Вільнюсе, шмат працуе ў галіне партрэтнага жывапісу і распрацоўвае вялікую кампазіцыю на тэму «Кастусь Каліноўскі».

Саюз совецкіх мастакоў БССР устанавіў цесную сувязь са сваім вільнюскім саратнікам па кісці і ў хуткім часе арганізуе ў Мінску выстаўку яго работ. У пісьме на імя ССМ БССР тав. Сергіевіч піша: «Атрымаў ад Вас пісьмо ў справе праектавання выстаўкі маіх работ у Мінску. Шчыра дзякую за Вашы прыхільныя адносіны да маёй справы. Калі прадстаўнікі Саюза совецкіх мастакоў БССР будуць у Вільнюсе, прашу наведаць маю працоўню».

І. РУБІНШТЭЙН.

На здымку — рэпрадукцыі з работ мастака **П. Сергіевіча:** 1) Аўтапартрэт, 2) Карціна «Барацьба са стыхіяй», 3) Партрэт беларускай настаўніцы.

На пленуме БРК саюза работнікаў мастацтваў

Гэтымі днямі адбыўся нечарговы пленум Беларускага рэспубліканскага камітэта саюза работнікаў мастацтваў. Даклад аб рабоце прэзідыума БРК саюза зрабіў старшыня прэзідыума тав. А. Арыярскі.

У спрэчках па дакладу прынялі ўдзел тт. Любан (Саюз кампазітараў БССР), Стэльмах (Тэатр юнага гледача БССР), Тарасаў (адказны сакратар ЦК саюза работнікаў мастацтваў, Масква), Кір'янаў (Пінскі абласны тэатр), Прагін (Філармонія БССР), Сяргееў (Дзяржаўны Рускі тэатр БССР), Арончык (Дзяржаўны Яўрэйскі тэатр БССР), Дадзіомава (Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР), Берман (Тэатр юнага гледача БССР), Гантман (Тэатр оперы і балета БССР), Герман (Мінскае музычнае вучылішча), Рымар (Радыёкамітэт БССР) і інш.

Усе выступаўшыя гаварылі аб рабоце, праробленай нізавымі прафсаюзнымі арганізацыямі на месцах, і аб рабоце прэзідыума БРК саюза. Работа прэзідыума БРК была падвергнута рэзкай крытыцы. Прэзідыум саюза не перабудаваў яшчэ сваю работу ў адпаведнасці з рашэннямі XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі і XI пленума ВЦСПС. Не гледзячы на тое, што БРК мае вялікі нізавы актыў, кіраваў ён гэтым актывам слаба. У выніку большасць грамадскіх прафсаюзных камісій не працавала. Нічога не рабіла камісія па шэфству над мастацкай самадзейнасцю. Дрэнна працавалі культкамісія, камісія зарплаты і арганізацыі працы. У большасці калектываў (Рускі тэатр БССР, ТЮГ, Пінскі абласны тэатр, Першы Дзяржаўны беларускі тэатр, Аршанскі калгасны тэатр і інш.) члены прафсаюза да гэтага часу не знаёмы з рашэннямі XI пленума ВЦСПС.

Зусім недастаткова займаўся прэзідыум БРК пытаннямі вытворча-рэпертуарных планаў, арганізацыі гастроляў і гледача, работы драматургаў і кампазітараў.

Да гэтага часу не разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва ў такіх буйных мастацкіх прадпрыемствах, як Тэатр оперы і балета, Першы Дзяржаўны беларускі тэатр. Прэзідыум БРК мала ўдзяляў увагі пытанням разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва ў тэатральных і музычных калектывах.

Слаба кіраваў прэзідыум БРК палітычна-выхаваўчай і культурна-масавай работай сярод членаў саюза. Існуючы пры Мінскім гаркоме КП(б)Б універсітэт марксізма-ленінізма работнікі мастацтваў наведваюць дрэнна. Не наладжана індывідуальнае вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» работнікамі мастацтваў.

Адсутнасць кантролю за фінансавай дзейнасцю БРК саюза з боку былога старшыні прэзідыума прывяла да буйнай растраты дзяржаўных грошай былым бухгалтарам БРК Л. Сількіным, справа аб якім перададзена ў пракуратуру.

Пленум БРК саюза прыняў рэзалюцыю, у якой намеціў рад мерапрыемстваў па карэннаму паляпшэнню работы прэзідыума. За нядбайнае кіраўніцтва фінансавай справай пленум вывеў са складу членаў прэзідыума БРК саюза былога старшыню прэзідыума тав. Зібіцкера і члена прэзідыума тав. Карасіка.

А. АСТРЭЙКА.

З газетнай пошты

Як пісаць рэцэнзію...

Ёсць яшчэ дзе-ні-дзе ў рэдакцыях раённых газет такія «журналісты», якія, атрымаўшы ад рэдактара заданне напісаць для чарговага нумара газеты заметку на пэўную тэму, робяць так. Знаёмяцца з прадпрыемствам, цэхам ці калгасам—адпаведна таму, на якую тэму трэба даць заметку. Запісваюць ход выканання плана (выпуску прадукцыі, пасадкі бульбы), прозвішчы стаханаўцаў, адстаючых, калі ёсць — зрыўшчыкаў. Затым прыходзяць у рэдакцыю, дастаюць з архіва камплект якой-небудзь цэнтральнай ці абласной газеты, і тут пачынаецца самае цікавае—нараджэнне заметкі. Старанна перагартаўшы камплект і адшукаўшы ў ім заметку на зададзеную тэму, яны, не абцяжарваючы сябе лішнімі мукамі творчасці, проста-напроста перапісваюць на чысты ліст паперы чужы твор, падстаўляючы толькі ў патрэбныя месцы даныя сваіх запісаў: назвы крытыкуемых аб'ектаў, процанты выканання плана, прозвішчы і г. д. Лёгка і добра!

Так бывае з вытворчымі тэмамі.

А як быць з астатнімі? Скажам, рэцэнзія на спектакль, на кінофільм, на новую кнігу?

Аказваецца, і ў гэтай справе растаропнымі «журналістамі» вынайдзен спосаб.

Рэцэнзія на кнігу пішацца так. Бярэцца гатовая рэцэнзія на адпаведную кнігу з другой газеты. Уступ яе, для скарачэння, выкідваецца. Наступны абзац апрацоўваецца ў якасці пачатку, да яго—для распырэння і для маскіроўкі плагіята—дадаецца частка заключнага абзаца, астатняя частка якога выкрэсліваецца. Потым перапісваюцца наступныя абзацы: падрабязнасці апускаюцца, некаторыя словы для стылю змяняюцца, цытаты пераносяцца цалкам, дадаецца неўпапад — па шаблону—пара ўласных фраз, ставіцца подпіс — і рэцэнзія гатова! Лёгка і добра, як і ў першым выпадку.

Мы не ведаем, Ал. Гарбачэнка—штатны супрацоўнік бабруйскай газеты «Камуніст», ці пазаштатны аўтар, які па ўласнай ініцыятыве напісаў рэцэнзію на аповесць М. Паслядовіча «Магістральны канал». Але мы дакладна ўстанавілі, што рэцэнзія Ал. Гарбачэнкі ў газеце «Камуніст» ад 30 мая—гэта «напісаная» ім вышэйпаказаным спосабам... рэцэнзія П. Кавалёва, апублікаваная 11 мая ў газеце «Звязда».

Шчыра кажучы, сорамна за рэдактара бабруйскай газеты тав. Грынштэйна, які, як відаць, не чытае цэнтральных газет...

„Мастацкая“ непатрэбшчына

У Беластоку па Ленінскай вуліцы нельга не спыніцца ля магазіна «Кераміка-кафля». Усю яго вітрыну займае ваза, выстаўленая на паказ беластачанам. Спыняе яна ўвагу сваёй уродлівасцю, адсутнасцю элементарнага мастацкага густу ў людзей, не толькі выпусціўшых яе ў свет, але і выставіўшых у вітрыне. Не так сама ваза, як дзікунскі пейзаж, якім яна ўпрыгожана. Пахіленая хатка на курыных ножках. Наабапал дрэвы фантастычнага паходжання. Каля хаткі стаіць пудала гарохавае, выдаваемае за чалавека, а ўся астатняя плошча вазы размалявана замысловатымі лініямі: ці то хвалі ракі, ці то поле, ці то дарога. Уяўляйце сабе, што хочаце. А сэнс гэтага высокага мастацтва вядомы толькі аднаму дырэктару Беластоцкага кафельнага завода тав. Фрыдлендэру і строга захоўваецца ім у сакрэце. Пакуль-што выпушчаны толькі два экземпляры гэтай вазы. Адзін выстаўлен для ўсеагульнага агляду, а другі ўпрыгожвае дырэктарскі кабінет. Такая абмежаваная колькасць, мусіць, загадзя ўлічана. Публіка наша, маўляў, не дарасла яшчэ, каб па-дастоінству ацаніць такую рэдкую з'яву ў мастацтве.

І сапраўды, спажывец не раздзяляе эстэтычных густаў тав. Фрыдлендэра. Калі каму і спатрэбіцца ваза — прыдзе ў магазін і настойліва патрабуе зафарбаваць мукі творчасці невядомага «мазілы». Спажыўцы самі прапануюць і ўзоры, і арнамент. «Прадукцыя ваша, афармленне наша», — гавораць яны і са спалохам адварачваюцца ад шэдэўра, выстаўленага ў вітрыне.

Мастацкую прадукцыю ў Беластоку выпускаюць кафельны завод і некалькі прамысловых арцелей. Іх асноўная вытворчасць — кафля і гаспадарчая пасуда, а мастацкія рэчы: вазы, статуэткі, бюсты, пісьмовыя прыборы — гэта пабочная справа, якой яны займаюцца, абы адбыць павіннасць, абы выканаць штомесячную планавую нагрузку па мастацкай прадукцыі. Адсюль і нізкаякаснае, часам яўна халтурнае афармленне рэчаў, выпускаемых для шырокага спажывання.

Кафельнаму заводу яшчэ больш-менш пашчасціла. Там працуе вопытны майстар — мастак тав. Пенчукоўскі. Выпускаемыя ім вазы для кветак і статуэткі ахвотна купляюць. Толькі займаецца мастацкай прадукцыяй тав. Пенчукоўскі па сумяшчэнню з сваёй асноўнай працай — выпускам гаспадарчай пасуды. У арцелях-жа паўнейшая безадказнасць за выраб мастацкіх рэчаў, іх вырабляюць людзі, не маючыя ні малейшага дачынення да гэтай справы. Для іх яна лішняя абуза. Усё тое, што выпускаецца арцелямі і часткова заводам, ні практычнай, ні мастацкай вартасці не ўяўляе. Каму патрэбны гэтыя пісьмовыя прыборы, попельніцы — грамоздкія, нязграбныя? Каб зрушыць іх з месца, трэба добра напатужыцца. Арцель «Уперад» парадавала хатніх гаспадынь салонкай, якая важыць... больш двух кілограм. Не практычны, але затое сапраўды фундаментальны твор!

Тоўсты пласт пылу пакрывае ўсе гэтыя «прыгожыя рэчы» на складах. Ахвочых купляць гэту «мастацкую» непатрэбшчыну няма, ды і каштуе яна не танна.

Вывад з гэтага можа быць толькі адзін. Пакуль выпуск мастацкай прадукцыі не будзе аб'яднаны ў адным пэўным месцы, пакуль ёю будуць займацца не спецыялісты, не мастакі, датуль марна будуць трáціцца дзяржаўныя сродкі.

В. ЦІМСКІ.

Беласток. (Наш кар.).

Выстаўка памяці А. М. Горкага

Пры ўрадавай бібліятэцы імя Горкага адкрылася выстаўка, прысвечаная памяці вялікага рускага пісьменніка А. М. Горкага.

На выстаўцы экспаніраваны амаль усе творы, выданыя М. Горкім пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Прадстаўлены асобныя томы твораў В. І. Леніна, у якіх змешчаны артыкулы і пісьмы Леніна да Горкага.

На выстаўцы паказаны выказванні аб М. Горкім К. Е. Варашылава і В. М. Молатава, працы совецкіх літаратараў, у прыватнасці—«Артыкулы аб Горкім» А. Луначарскага, «Горкі і яго час» Груздзёва, «Горкі—паэт» Піксанава і інш.

Асобны раздзел займае стэнд «М. Горкі і беларускі народ», у якім паказаны выданні твораў пісьменніка на беларускай мове.

Вялікі раздзел на выстаўцы займае стэнд «М. Горкі і МХАТ».

Выстаўка багата ілюстрыравана фотаздымкамі М. Горкага, рысункамі совецкіх мастакоў да яго кніг, фотаілюстрацыямі да спектакляў па п'есах М. Горкага.

Фестываль выдатнікаў музшкол

11—13 чэрвеня ў памяшканні Дзяржаўнай філармоніі БССР адбыўся фестываль вучняў-выдатнікаў музычных школ Беларусі. У фестывалі ўдзельнічала 150 вучняў з 19-ці музычных школ, прысутнічала 80 педагогаў-выкладчыкаў музыкі. Упершыню ў гэтым фестывалі прымалі ўдзел вучні музшкол заходніх абласцей рэспублікі.

Адкрылі фестываль выдатнікі вучобы старэйшай у БССР Магілеўскай музычнай школы, якая нядаўна адзначыла сваё 20-годдзе. Дзеці добра выканалі як рускія і заходнееўрапейскія класічныя музычныя творы, так і творы совецкіх кампазітараў.

Добрае ўражанне пакінулі таксама выступленні вучняў Віцебскай, Маладзечанскай, Бабруйскай, Гомельскай школ.

Нядрэнна паказалі сябе на фестывалі Гродненская, Беластоцкая, Пінская і Баранавіцкая музычныя школы.

11 чэрвеня ў Філармоніі БССР сіламі ўсіх лепшых калектываў для ўдзельнікаў фестываля быў дадзен вялікі канцэрт, а 12 чэрвеня лепшыя вучні Магілеўскай школы выступілі ў радыёперадачы, арганізаванай Радыёкамітэтам БССР.

Сёння, 14 чэрвеня, адбудзецца пасяджэнне журы фестываля з удзелам педагогаў-выкладчыкаў.

Песні аб асушцы балот

Кампазітар І. Любан напісаў на тэкст паэта П. Броўкі «Балоты наша гора» масавую песню. Гэтую песню выконвае ансамбль песні і пляскі Дзяржаўнай філармоніі БССР.

Кампазітар С. Палонскі стварыў музыку на тэкст з «Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну» — «А нашы балоты» тры песні на тэксты паэта М. Клімковіча: «Вячэрні спеў», «Жарт і праўда» «Каб зніклі балоты» і арыёза на тэкст А. Астрэйкі «Ці зналі, ці ведалі». Песні прыняты да выканання Радыёкамітэтам і Домам народнай творчасці для мастацкай самадзейнасці.

Сустрэча пісьменнікаў з чыгуначнікамі

7 чэрвеня ў клубе беластоцкіх чыгуначнікаў па ініцыятыве комсамола чыгункі праведзен літаратурны вечар, прысвечаны азнаямленню з творчасцю пісьменнікаў заходніх абласцей БССР.

Ва ўступным слове старшыня Беластоцкага аддзялення ССП БССР тав. Пестрак расказаў сабраўшымся, як Совецкая ўлада, вызваліўшая працоўных Заходняй Беларусі ад белапольскай акупацыі, уважліва і клапатліва стварае ўмовы для росквіту сацыялістычнай культуры.

З чыткай сваіх твораў на вечары выступілі Максім Танк, Ф. Пестрак, І. Рубінштэйн, М. Бродэрзон і Ю. Равін.

Беласток.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

Мінск, друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва. Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394.